ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПАНЯДЗЕЛАК, 6 ЧЭРВЕНЯ 1938 г. № 31 (373)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

КАНДЫДАТЫ НАРОДА

Радасныя, незабыўныя дні перажывае наша ордэнаносная Беларуская ССР.

Непахісна палітычнае і маральнае адзінства народа, непарушны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных. Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ператварылася ў магутную палітычную дэманстрацыю несакрушальнай сілы совецкага народа.

Беларускі народ, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пры братняй дапамозе герaічнага рускага народа, крывёю і намаганнямі лепшых сваіх сыноў заваяваў шчаслівае і радаснае жыццё і ідзе па шляху да пабудовы комуністычнага грамадства, ні на адну мінуту не забываючы аб тым, што ён жыве і працуе на стыку з фашысцкай Польшчай.

Беларускі народ ганарыцца тым, што на тэрыторыі Совецкай Беларусі, як і ва ўсім Совецкім Саюзе, ператорaны ў жыццё благароднейшыя думкі лепшых людзей многіх пакаленняў аб свабодзе і шчасці народа, аб росквіце чалавечай асобы.

Няма межаў радасці народа, якому выпала шчасце зарэгістраваць сваім першым кандыдатам у соцыялістычны парламент рэспублікі вялікага правадыра ўсяго працоўнага і прыгнечанага чалавецтва Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. З імем Сталіна звязан росквіт Совецкай Беларусі ў сям'і братніх совецкіх соцыялістычных рэспублік. Сталін — тварэц дзяржаўнасці Совецкай Беларусі.

У сваім пісьме таварышу Сталіну 150-тысячны мітынг выбаршчыкаў горада Менска піша:

«Галасуючы за Вас, таварыш Сталін, увесь беларускі народ галасуе за нашу вялікую, непераможную партыю большэвікоў, якая пад Вашым мудрым кіраўніцтвам прывяла нас да соцыялізма і вядзе нас да ззяючых вяршынь комунізма.

... Галасуючы за Вас, таварыш Сталін, мы разам з усім вялікім магутным совецкім народам галасуем за ўрачыстасць міжнароднай пролетарскай рэволюцыі, за перамогу комунізма ва ўсім свеце, за свабоду і шчасце ўсяго чалавецтва».

Бязмежна радасць народа які ўдастоіўся гонару галасаваць 26 чэрвеня за лепшых з лепшых людзей краіны, за саратнікаў вялікага Сталіна, кіраўнікоў партыі і совецкага ўрада — таварышоў В. М. Молатава—старшыню СНК СССР, М. І. Калініна — старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, К. Е. Варашылава — наркома Абароны СССР, Н. І. Ежова — наркома ўнутраных спраў СССР, А. І. Мікаяна — намесніка старшыні СНК СССР, А. А. Андрэева—сакратара ЦК ВКП(б), Л. М. Кагановіча—народнага камісара цяжкой прамысловасці і шляхоў зносін СССР і А. А. Жданава—сакратара ЦК ВКП(б) і Ленінградскага абкома.

З велізарным энтузіязмам будуць галасаваць працоўныя Совецкай Беларусі за тых, хто разам з геніямі чалавецтва Леніным і Сталіным арганізоўваў рускі пролетарыят на барацьбу з царскім самадзяржаўем, за перамогу соцыялістычнай рэволюцыі, хто ўсё сваё жыццё аддае барацьбе за шчасце народа. Галасуючы за верных саратнікаў вялікага Сталіна, працоўныя БССР будуць галасаваць за вялікую партыю большэвікоў, за яе сталінскі Цэнтральны Камітэт, за Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Беларускі народ вылучыў сваімі кандыдатамі ў соцыялістычны парламент БССР комуністаў і беспартыйных, якія непахісна ідуць па шляху, акрэсленаму Леніным, — тых, хто беззаветна любіць радзіму, хто жыве клопатамі аб інтарэсах народа і ўсе сілы, калі трэба і жыццё, гатоў аддаць за соцыялізм.

Кандыдатамі ў дэпутаты з'яўляюцца лепшыя сыны і дочкі беларускага народа, кіраўнікі партыі і совецкай улады, стаханаўцы і стаханаўкі, калгаснікі і калгасніцы, людзі навукі і фізічнай працы, работнікі літаратуры і мастацтва. Вось некаторыя з іх:

А. А. Волкаў — выконваючы абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б, А. М. Лявіцкі — выконваючы абавязкі другога сакратара ЦК КП(б)Б, А. А. Наседкін — камісар унутраных спраў БССР, Е. К. Жур — старшыня Пухавіцкага РВК, Е. Я. Кульба — загадчыца МТФ калгаса імя Леніна Падгайскага сельсовета, С. І. Марозаў — маёр, пагранічнік, Н. Я. Наталевіч — выконваючы абавязкі старшыні ЦВК БССР, А. Ф. Кавалёў — старшыня СНК БССР, Ф. М. Шамко — даярка соўгаса «Зарэчча» Смалявіцкага раёна, С. Г. Давыдоўская — камбайнерка Грэскай МТС, К. В. Горэў — прэзідэнт Акадэміі навук БССР, М. Ф. Пыж — старшыня калгаса «Пяцігодка» Пухавіцкага сельсовета, М. М. Лынькоў — старшыня праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, А. В. Багатыроў і А. Е. Туранкоў — кампазітары БССР.

У нашай краіне невычарпальная крыніца талентаў, выдатнейшых сыноў і дачок радзімы, даказаўшых на справе сваю адданасць партыі Леніна — Сталіна, народу, людзей, гераізм якіх чакае свайго мастака.

Партыя Леніна — Сталіна выхавала дзяржаўных дзеячоў новага тыпу — людзей працы, навукі і мастацтва.

Беларускі народ даказаў сваю адданасць справе соцыялізма вылучэннем кандыдатамі ў дэпутаты сваіх лепшых сыноў і дачок, герояў і гераінь, абараняючых інтарэсы соцыялістычнай бацькаўшчыны, умеючых выкарчоўваць і знішчаць ворагаў народа — трацкісцка-бухарынскіх агентаў фашызма. Працоўныя Совецкай Беларусі абяцаюць сталінскаму ЦК, совецкаму ўраду і надалей мацаваць магутнасць Совецкай Беларусі, як магутнага фарпоста Совецкага Саюза на яго заходніх граніцах, мацаваць гонар краіны соцыялізма — нашу Чырвоную Армію.

Работнікі літаратурна - мастацкага фронта павінны апраўдаць тое давер'е, якое аказана ім партыяй і совецкім народам вылучэннем лепшых з іх кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета. Гэта давер'е яны павінны апраўдаць сваёй плённай творчай работай і грамадскай дзейнасцю, актыўна ўдзельнічаючы ў падрыхтоўчай кампаніі да выбараў.

Ніколі не забываючы словы таварыша Сталіна, беларускі народ будзе патрабаваць ад сваіх абраннікаў: «...каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абывацеляў, каб яны заставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу, каб яны былі такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодным ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін, каб яны былі гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін, каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін, каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

Дзень выбараў — 26 чэрвеня — дзень найвялікшай урачыстасці працоўных БССР, якія сустрэнуць яго новымі вытворчымі перамогамі на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Народ Совецкай Беларусі аддасць свае галасы выпрабаваным большэвікам — партыйным і непартыйным, совецкім патрыётам, барацьбітам за соцыялізм, за шчасце народа.

У дзень выбараў Вярхоўнага Совета рэспублікі працоўныя БССР, як і ўсе народы неасяжнага Совецкага Саюза, прадэманструюць перад усім светам сілу свайго маральнага і палітычнага адзінства, сваю аддачасць большэвіцкай партыі, яе ленінскаму ЦК, натхніцелю непераможнага блока комуністаў і беспартыйных — вялікаму Сталіну.



ГОРЭУ Канстанцін Васільевіч, прэзідэнт Акадэміі навук БССР — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад Рагачоўскай гарадской выбарчай акругі.



МЕЛКІХ Сяргей Міхеевіч — прафесар менскага мед. інстытута, — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад Кіраўскай выбарчай акругі № 263 г. Гомель.



ЯКІМОВІЧ Іван Клеменцевіч—выкладчык гісторыі рэчыцкага педвучылішча, — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад Рэчыцкай гарадской выбарчай акругі.



ТУРАНКОУ Аляксей Еўлампіевіч, кампазітар — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад Дзімітраўскай выбарчай акругі гор. Менска.

Янка Купала

Нашым кандыдатам ў Вярхоўны Совет БССР— таварышам Сталіну, Молатаву, Варашылаву і Ежову

Не аб сонцы, што нам свеціць
І зімой і летам,
Не аб зорках, што міргаюць
Ночкамі над светам;

Не аб сяміцвет-вясёлках
Фарбаў негаданых,
Што красу ў сябе ўбіраюць
З мора-акіянаў;

Не аб снах, у якіх сніцца
Доля, шчасце людзям,
Не аб казках, дзе цудоўна
Цуд ідзе на цудзе, —

Мая песня сёння будзе
Радасцямі ройнай —
Аб любімых кандыдатах
У Совет Вярхоўны.

Хто з нас думаў, спадзяваўся,
Мой ты, родны браце,
Што такіх мы кандыдатаў
Будзем выбіраці.

Сталін, Молатаў любімы,
Слаўны Варашылаў,
Ды Ежоў, што дыверсантаў
Загнаў у магілу!

Во каго мы ў дэпутаты
Па новым законе
У парламент беларускі
Выбярэм сягоння!

***

Сталін друг наш, друг народаў,
Друг людзей, свабоды,
Колькі радасці прыносіць,
Шчасця ў нашы годы!

Яго мудрыя законы
Сонцам ясна ўзыдуць
Для вякоў, для пакаленняў,
Што ідуць, што прыдуць.

Канстытуцыі векпомнай
Слова залатое
Напісаў нам добрым сэрцам,
Дбалаю рукою.

Звіні звонка, мая песня,
Ляці вышай, далей!
Беларускую дзяржаву
Збудаваў нам Сталін!

***

Нашым Молатаў славуты
Дэпутатам будзе,
Бо дзе лепшага мы знойдзем,—
Падумайце, людзі!

Ен дзяржаваю кіруе,
У крыўду не падасца,
Люд рабочы яго любіць,
Ворагі баяцца.

Чалавек ён гаспадарны,
Скажам смела ў вочы,
Аб рэспубліках совецкіх
Дбае днём і ночай.

Дзень і ноч працуюць дружна
Фабрыкі, заводы,
Землі родзяць ураджайна,
Буйней з кожным годам.

***

Варашылаў калісь войска
Вадзіў у паходы,
Інтэрвентам, акупантам
Не даваў праходу.

Біў, як мух, белагвардзейцаў,
Не даў ходу зброду,
І совецкую краіну
Вывеў на свабоду.

Як ужо мы выбіралі
Мінулага году,
А дні выбараў былі нам
Светлай асалодай.

А йшчэ скажам: як што прыдзе,
Як нам зробяць шкоду,—
Стар і мал, усе з ім разам
Пойдзем у паходы.

***

Слава нашаму Ежову,
З Ленінграда родам,
Што расправіўся, як следна,
З дыверсанцкім збродам!

Што шляхі расчысціў у нашым
Ясным падарожжы,
Што трацкістаў азвярэлых
Выкрыў і знішчожыў.

Больш на нас не рыне банда
Ашалелай сукай,
З-за вугла нас не падсочыць
Подлая гадзюка.

Слава нашаму Ежову,
З Ленінграда родам,
Што расправіўся, як следна,
З дыверсанцкім збродам!

***

Людзі ходзяць урачыста
У святочных строях,—
А з павагай з санавітай,
Ходзяць як героі.

Людзі ходзяць, веселяцца.
У думках іхніх свята,
А на вуснах іх імёны
Слаўных кандыдатаў.

Менск, 25.V. 1938.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ДЗІМІТРАУСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 159 ГОР. МЕНСКА ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ БССР АБ РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТА У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОУНАГА СОВЕТА БССР ТАВАРЫША

Аляксея Еўлампіевіча ТУРАНКОВА

Разглядзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 48, 49, 50, 51 і 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанавіла:

На падставе артыкула 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Дзімітраўскай выбарчай акрузе № 159 гор. Менска выстаўленую аб'яднанымі перадвыбарчымі сходамі рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода «Чырвоны Хімік», хлебазавода, шпалернай фабрыкі імя Вароўскага, сойлачнай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік», сварняжнай фабрыкі «1 Мая», абутковай фабрыкі індывідуальнага пашыву, арцелей імя Крупскай і «Пролетарый», на якіх прысутнічала 2399 чалавек, кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварыша АЛЯКСЕЯ ЕУЛАМПІЕВІЧА ТУРАНКОВА, 1886 года нараджэння, беспартыйнага, кампазітара БССР, пражываючага ў гор. Менску.

На падставе артыкула 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру таварыша АЛЯКСЕЯ ЕУЛАМПІЕВІЧА ТУРАНКОВА ў выбарчы бюлетэнь па Дзімітраўскай выбарчай акрузе № 159 гор. Менска.

У адпаведнасці з артыкулам 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі А. ЖЫГАЛАЎ.
Намеснік старшыні камісіі Г. ПАРАШЧАНКА.
Сакратар камісіі А. ПУШКІН.
Члены камісіі: П. КАСЦЯНЕВІЧ, І. КРЭСІК, З. ОКУНЬ, Е. СЕНЬКО, Я. БУДРЫК, А. МАЛЬЧЭУСКІ.

Сустрэчы з кандыдатам ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. А. Е. Туранковым

Гэтымі днямі на першым выбарчым участку Дзімітраўскай выбарчай акругі гор. Менска адбыўся перадвыбарчы сход, прысвечаны сустрэчы выбаршчыкаў са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР—кампазітарам **Аляксеем Еўлампіевічам Туранковым.** На сход сабралося каля 500 выбаршчыкаў.

Тав. А. Е. Туранкоў выступіў на сходзе з прамовай, якая была выслухана з вялікай увагай.

— Таварышы,—заявіў тав. Туранкоў,—дазвольце падзякаваць вас за давер'е, якое вы мне аказалі, вылучыўшы мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Нідзе, ні ў якой іншай краіне работнікі мастацтваў не маюць такога высокага гонару. Гэта магчыма толькі ў нас, у краіне, дзе работнікі мастацтваў акружаны такой выключнай увагай і клопатамі з боку нашай комуністычнай партыі і ўрада.

Наша Совецкая Беларусь законна ганарыцца сваімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, музыкальнымі школамі, Дзяржаўнай кансерваторыяй, сваімі тэатрамі, кіно, радыё. Совецкая Беларусь законна ганарыцца сваімі дасягненнямі ва ўсіх галінах прамысловасці, сельскай гаспадаркі і мастацтва.

Новыя песні пяе вызвалены беларускі народ—песні аб радасці і шчасці народным, песні аб вялікім Сталіне — лепшым другу беларускага народа.

Мая заветная мара стаць кампазітарам магла быць ажыццёўлена толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. З таго часу я пішу музыкальныя творы, якія апяваюць вызвалены совецкі народ, радасць і шчасце працоўных Совецкай Беларусі.

Абавязваюся ўсё сваё жыццё аддаць на карысць нашай совецкай культуры, пісаць музыкальныя творы, вартыя нашай вялікай Сталінскай эпохі...

Адзін за другім з кароткімі гарачымі прамовамі выступілі рабочы завода ланцугоў Галля тав. **Пэрльман,** агітатар тав. **Майзес,** хатнія гаспадыні тт. **Лобач, Эфрон, Піткевіч** і інш.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі Дзімітраўскай выбарчай акругі гор. Менска тав. **Жыгалаў** звярнуўся да ўсіх выбаршчыкаў з заклікам дружна і арганізавана галасаваць за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за беспартыйнага кампазітара **Аляксея Еўлампіевіча Туранкова.**

***

30 мая на 10 участку Дзімітраўскай выбарчай акругі адбылася другая сустрэча выбаршчыкаў са сваім кандыдатам тав. А. Е. **Туранковым.** З прачулай прамовай выступіў тав. Туранкоў. Выбаршчыкі — хатняя гаспадыня тав. **Мельцэр,** рабочы завода «Чырвоны Хімік» тав. **Цукерман** і інш. звярнуліся з заклікам да ўсіх выбаршчыкаў галасаваць за тав. Туранкова — кандыдата блока комуністаў і беспартыйных.

На ўсіх участках Дзімітраўскай выбарчай акругі шырока разгарнулася агітацыя за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Агітатары падрабязна знаёмяць выбаршчыкаў з біяграфіяй свайго кандыдата—кампазітара тав. А. Е. Туранкова.

ВЕЛІЗАРНАЯ ПЕРАМОГА СОВЕЦКІХ ПІЯНІСТАЎ

Міжнародны конкурс піяністаў, які днямі закончыўся ў Бруселі, зноў прынёс перамогу совецкім музыкантам. Эмілю Гілельсу прысуджана першая прэмія, Якаву Фліеру—трэцяя.

Эміль Гілельс яшчэ вельмі малады (1916 года нараджэння), але яго даранне расцвіло з незвычайнай сілай. Пяць год назад Гілельс, прыехаўшы ў Маскву на першы ўсесаюзны конкурс музыкантаў-выканаўцаў, заваёўвае першае месца, пасля чаго паступае для ўдасканальвання да прафесара-ордэнаносца, заслужанага дзеяча мастацтваў Нейгауза. Два гады назад Гілельс атрымлівае другую прэмію на міжнародным конкурсе ў Вене.

Пад кіраўніцтвам такога выключнага майстра-мастака, якім з'яўляецца праф. Нейгауз, даранне Гілельса расцвітае са здзіўляючай хуткасцю.

Школа праф. Нейгауза атрымала сусветную вядомасць. Страснасць, з якой праф. Нейгауз адносіцца да твораў геніяльных кампазітараў, раскрывае мастацкую сутнасць твора, — гэта страснасць і змястоўнасць цалкам перадалася яго выдатнаму вучню Эмілю Гілельсу. Уладаючы прадзыёзнай віртуознасцю, Гілельс з лёгкасцю перамагае ўсе тэхнічныя цяжкасці. Маштаб даравання ў Гілельса зусім выключны. Яго новая перамога гэта пачатак цудоўнага мастацка-артыстычнага шляху.

Якаў Фліер—піяніст вялікага размаху, натхнення і парыву, ён майстар вялікіх рамантычных палотнаў. Ігра Фліера заўсёды страсная і напружаная. Велізарны тэмперамент і пафас яго выканання цалкам заваёўвае аудыторыю. Фліер з'яўляецца выхаванцам аднаго з самых выдатных і тонкіх мастакоў-педагогаў—праф. Ігумнава.

Імёны Гілельса і Фліера для нас такія-ж дарагія, як імёны нашых праслаўленых герояў. Толькі ў нашай свабоднай краіне могуць так цудоўна развівацца таленты, дзякуючы велізарным клопатам і ўвазе партыі і ўрада і асабіста таварыша Сталіна, любві ўсяго совецкага народа да нашых майстроў мастацтва. Мы ўправе сказаць, што лепшае ў свеце мастацтва—гэта совецкае мастацтва.

А. КЛУМАУ,
дацэнт Дзяржаўнай кансерваторыі БССР.

Кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных

Закончылася рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Акруговыя выбарчыя камісіі, выконваючыя волю народа, уключылі ў выбарчыя бюлетэні лепшых прадстаўнікоў рабочых, калгаснікаў, чырвонаармейцаў, працоўнай інтэлігенцыі. Кандыдатамі ў дэпутаты вярхоўнага органа ўлады Беларускай ССР вылучаны самыя дастойныя, заслужаныя большэвікі — партыйныя і непартыйныя: стаханаўцы заводаў і соцыялістычных палёў, кіраўнікі адказнейшых участкаў народнай гаспадаркі, партыйныя і совецкія работнікі, людзі працы і навукі, мастацтва і літаратуры.

Кожная перадвыбарчая нарада, кожны перадвыбарчы сход, на якіх вылучаліся кандыдаты, з'яўляліся яркай дэманстрацыяй несакрушымасці сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Імёны верных сыноў нашага народа, верных сыноў нашай партыі выклікалі ўсеагульны энтузіязм і аднадушную ўхвалу.

У ліку зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР— шмат прадстаўнікоў совецкай інтэлігенцыі, прадстаўнікоў нашай перадавой навукі і медыцыны.

Выбарчая камісія Рагачоўскай гарадской выбарчай акругі зарэгістравала кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР прэзідэнта Акадэміі навук БССР **Канстанціна Васільевіча Горэва.**

Выбарчая камісія Кіраўскай выбарчай акругі гор. Гомеля зарэгістравала кандыдатуру **Сяргея Міхеевіча Мелкіх** — прафесара медыцыны, які за ўсю сваю шматгадовую медыцынскую і настаўніцкую дзейнасць заслужыў усеагульную павагу шырокіх працоўных мас.

Па Барысаўскай выбарчай акрузе зарэгістравана кандыдатура **Ільі Іосіфавіча Ліпкінда** — урача барысаўскай больніцы, уважлівага, удумлівага работніка, грамадскага дзеяча.

Сярод кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР — лепшыя прадстаўнікі інжынераў і тэхнікаў, якія аддаюць усе свае веды, усю сваю энергію на ўдасканаленне нашых прадпрыемстваў, на арганізацыю стаханаўскага руху.

Выбарчая камісія Смальянскай выбарчай акругі № 30 (Віцебская вобласць) зарэгістравала кандыдатуру **Марыі Антонаўны Сцяпанавай,** 1912 года нараджэння, інжынера-тэхнолага Аршанскага ільнокамбіната.

Па Фрунзенскай выбарчай акрузе № 266 гор. Гомеля зарэгістравана кандыдатура **Платона Цімафеявіча Сталярова** — інжынера, галоўнага механіка Гомельскага паравоза-вагонарамонтнага завода.

Па Рагачоўскай сельскай выбарчай акрузе № 237 (Гомельская вобласць) зарэгістравана кандыдатура **Ніны Грыгор'еўны Стасенка,** 1912 года нараджэння, інжынера Рагачоўскага лесазавода імя Халтурына.

Па Чэрвеньскай гарадской выбарчай акрузе Менскай вобласці зарэгістравана кандыдатура **Ольгі Наумаўны Радчанка** — старэйшага агранома Чэрвеньскай МТС, інжынера соцыялістычных палёў.

Зарэгістраваны кандыдатуры ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР двух лепшых прадстаўнікоў нашага музыкальнага мастацтва — кампазітараў **Аляксея Еўлампіевіча Туранкова і Анатолія Васільевіча Багатырова.**

Па Рэчыцкай гарадской выбарчай акрузе № 255 (Гомельская вобласць) зарэгістравана кандыдатура **Івана Кліменцевіча Якімовіча** — выкладчыка гісторыі ў Рэчыцкім педвучылішчы, 1908 года нараджэння.

Па Суражскай выбарчай акрузе № 60 (Віцебская вобласць) зарэгістравана кандыдатура кіраўніка пісьменніцкай арганізацыі БССР — старшыні праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР **Міхася Ціхонавіча Лынькова.**

Лепшыя прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты вярхоўнага органа Беларускай ССР.

ВІЦЕБСК

НАРЫС Ю. ВІЦЬБІЧА

Ёсць на Балтыйскім моры суровы востраў Готланд. На тым востраве існуе з даўных-даўён горад Вісбі. Гэты невялікі горад здабыў калісьці сабе вялікую, але незайздросную славу. Яго грамадзяне сустракаліся на ўсіх тагочасных гандлёвых шляхах альбо як разбойнікі, альбо як падобныя да разбойнікаў купцы. Каля тысячы год таму назад, шукаючы карацейшай дарогі да Царграда, купцы Вісбі падняліся на Дзвіне ўгору, за крывічанскі Полацк, і там, дзе яна бліжэй за ўсё падыходзіць да Дняпра, заснавалі на чужой зямлі з разбойніцкай бесцырамоннасцю горад, які назвалі ў гонар свайго роднага горада Віцебскам.

Прыблізна, так успамінае аб Віцебску нарманская Готсага, але зусім інакш тлумачыць яго нараджэнне летапіс Панцырнага:

«У год 974 Ольга, пасля перамогі над ятвагамі і печанегамі, пераправілася праз Дзвіну і заначавала. Спадабалася ёй гара і яна заснавала замак, назваўшы яго ад ракі Віцьбы — Віцебскам».

І Готсага і летапіс не вытрымліваюць у даным выпадку гістарычнай крытыкі. Паходжанне і ўзрост Віцебска дакладна невядомы. Толькі не падлягае сумненню, што існуе ён не менш за тысячу год, а таму, хто ведае яго гісторыю, зразумела, што не менш за тысячу год існуе і прыказка беларускага народа: «Кепска каля Віцебска».

Гісторыя Віцебска гэта ёсць гісторыя ўпартай барацьбы народа са сваімі заядлымі ворагамі. Горад апошнім з беларускіх гарадоў пашаў спярша пад уладу літоўскіх князёў, а потым польскіх каралёў. Яго не аднойчы спальвалі ў прах, шмат яго жыхароў загінула ў лютых баях, ад якіх ружавела ў нашых рэках вада і згарбацілася незлічонымі курганамі наша зямля, шмат іх загінула на літоўскіх і польскіх шыбеніцах і плахах. Невядомыя іх імёны мы сёння ўспамінаем з вялікай любоўю і цеплынёй, бо гэта іх гарачай крывёю пісалася гераічная гісторыя вольналюбівага беларускага народа.

Перагортваючы старонкі гэтай гісторыі, мы бачым, як у 1170 годзе віцебляне, на чале са сваім князем Давідам, удзельнічаюць у агульным паходзе рускіх князёў супроць полаўцаў. Бачым не аднойчы у Віцебску славутага пераможца нямецкіх «псоў-рыцараў» — князя Аляксандра Неўскага жанатага на дачцы віцебскага князя Брачыслава. Прыехаўшы ў 1245 годзе са сваім сынам, Александр Неўскі па дарозе пад Усвятам разбіў і ўзяў у палон шмат літоўскіх князёў. У 1342 годзе да віцебскага князя Ольгерда прыйшлі з Пскова, якому пагражалі лівонскія рыцары, паслы і сказалі: «Братья наши новгородцы нас повергли, не помогают нам: помози нам, господине, в се время». Адразу-ж віцебскія палкі накіраваліся ў Пскоў. Немцы дайшлі да Ізборска, калі даведаліся, што на дапамогу Пскову прышоў Віцебск, і без бою адступілі назад.

Яшчэ больш ярка выступае барацьба віцеблян з адвечнымі ворагамі народа пры князю Свідрыгайлу. Польскія хронікі з нянавісцю ўспамінаюць гэтага князя, і палякам сапраўды ёсць за што яго ненавідзець.

У 1390 годзе княгіня Іуліянія адказала Віцебск свайму малодшаму сыну Свідрыгайлу, але вялікі літоўскі князь, а потым польскі кароль Ягайла адабраў яго ў свайго роднага брата Свідрыгайлы і паслаў туды намеснікам лоўчага Фёдара Вясну. Пакрыўджаны Свідрыгайла з невялікім атрадам захапіў Віцебск. Намесніка Вясну ён загадаў скінуць з высокай Замкавай сцяны ў Дзвіну. Ягайла паслаў Вітоўта пакараць непакорнага брата. Перамагаючы супраціўленне Друцка і Оршы, Вітоўт з боем заняў Віцебск. Свідрыгайлу даравалі яго непакорнасць, але праз тры годы ён па папярэдняй умоўленасці з віцеблянамі зноў захапіў Віцебск. Цяпер Вітоўту прышлося трыццаць дзён асаджаць горад, штурмаваць кожны з яго замкаў, кожную вуліцу, кожны завулак. Пасля перамогі ён шмат віцеблян пакараў смерцю, а самога Свідрыгайлу ў кайданах пехатой накіраваў да Ягайлы.

У 1430 годзе памірае вялікі літоўскі князь Вітоўт. Па аднадушнаму жаданню народа, кароль Ягайла спачатку хацеў аддаць вялікакняжацкі прастол Свідрыгайлу, але Свідрыгайла, які любіў усё рускае і ненавідзеў усё польскае, не мог, зразумела, падабацца палякам. Яны ўтаварылі караля аддаць прастол Сігізмунду, якога падтрымала ўся каталіцкая Літва. Віцебск разам з Полацкам і Смаленскам трымаў бок Свідрыгайлы, які ўсё-ж у 1432 годзе быў разбіт Сігізмундам і ледзь выратаваўся сам у Полацк. Праз год Свідрыгайла накіраваўся ў Віцебск. Віцебляне сустрэлі яго вельмі гасцінна і адкрылі перад ім вароты ўсіх сваіх замкаў. Свідрыгайла загадаў прыхільнікаў Сігізмунда: князя Пястрыцкага — завязаць у мяшок і кінуць у праламку, а князя Ольшанскага—скінуць з Замкавай гары. І ў гэты-ж час, як гаворыць летапіс: «Свідрыгайла поима митрополита Герасима в городе Смоленьске, и окова твердо железы, и спровади в Видбеск и сожже огнем за толику вину, што перевет на него держал к князю Жигимонту». Лазутчыка польскіх каралёў Герасіма спалілі на вялікім камні на беразе Дзвіны.

У 1435 годзе пад Вількомірам, у крывавай бітве з ляхамі, віцебскія, полацкія і смаленскія палкі Свідрыгайлы былі разбіты. Колькасць забітых з абодвух бакоў дасягала 50 тысяч. Віцебскае княства пакарылася Сігізмунду, але замак Віцебск застаўся верным Свідрыгайлу. Шэсць тыдняў асаджаў гэты замак сын Сігізмунда — Міхаіл і не здолеў узяць. З лаянкі тагочасных польскіх хронік відаць, што віцебляне тады пакрылі сябе неўміручай славай. Толькі праз два годы здаўся Віцебск і Свідрыгайла згубіў сваю апошнюю апору. Пасля гэтага пачынаецца паступовае апалячванне разам з усёй краінай і Віцебска, у чым дапамагаюць палякам былыя беларускія магнаты.

Каб лепш зразумець усю складанасць барацьбы беларускага народа з палякамі, трэба ўспомніць тут адзін твор віцебскага праваслаўнага архіепіскапа Мілеція Сматрыцкага. Гэта той самы Сматрыцкі, на падставе граматыкі якога Ламаносаў пісаў першую граматыку рускай мовы, і, нарэшце, гэта той Сматрыцкі, імем якога забіты віцеблянамі ўніяцкі архіепіскап Іосафат Кунцэвіч называў свайго сабаку. У Сматрыцкага ёсць высокамастацкі твор «Плач», дзе праваслаўная царква, якую аўтар атоесамлівае з Белай Руссю, аплаквае здрадніцтва беларускіх магнатаў:

«Дзе вы, славутыя роды рускіх князёў: Сапегі, Радзівілы, Вішнявецкія, Сангушкі, Чартарыйскія, Карсакі, Саламарэцкія, Слуцкія, Лукомскія, Пацы, Трызны, Пацэі і іншыя без ліку? Вы агалілі мяне, здрадцы, і цяпер здзекуецеся з майго цела, што вас нарадзіла. Толькі помніце — праклятыя ўсякі, хто агаляе нагату сваёй маткі».

Але народ не плакаў. Замардаваны, закуты, ён змагаўся і з сваімі здраднікамі і з палякамі. У 1623 годзе віцебская мяшчанская галеча паказала ўсяму свету, на што здольны ў абароне сваёй нацыянальнай незалежнасці народ.

У барацьбе з беларускім народам рэлігійная унія з'яўлялася для палякаў зброяй мацнейшай за гарматы. Яна несла з сабой апалячванне мяшчанам і сялянам, і асаблівая роля ў яе прасоўванні належала ўніяцкаму архіепіскапу Іосафату Кунцэвічу. Добра вядомы па ўсёй Беларусі як драпежнік у расе, выгнаны з Вільні, Полацка і Магілева, Кунцэвіч, прыехаўшы ў Віцебск, адразу закрыў усе праваслаўныя цэрквы, а потым прапанаваў абмежаваць праваслаўных у правах і павялічыць для іх падаткі.

12 лістапада 1623 года над горадам загуў набат. Віцебляне з крыкам: — Смерць непагамаванаму панежніку! Смерць чорнаму гругану! — рынуліся да хаты архіепіскапа і забілі яго. Адразу пасля забойства цэхмістры і гандляры, лаўнікі і радцы разбегліся па сваіх хатах. Засталася толькі мяшчанская галеча. Прывязаўшы да трупа вяроўку, мужчыны павалаклі яго па вуліцах горада і пры гэтым крычалі:

—У ляшскую веру прымае, пушахват! Падаткі збірае пан архіепіскап!

Жанчыны, прыгрукваючы лапцямі, пялі:

Едзе п'яны з Рыму пан,
Паважаны наш плябан.

Худыя хлапчукі шпурлялі ў забітага абледзянелымі камякамі гразі.

Пасля труп скінулі з Замкавай сцяны, а там рыбакі прывязалі да яго каменне, адвезлі па Дзвіне ўгору і ўтапілі. Толькі на трэці дзень, па загаду каштэляна замка, труп выцягнулі і павезлі ў горад Полацк. Даведаўшыся аб забойстве, папа Урбан VIII пісаў каралю Сігізмунду III:

«Няхай будзе праклятым той, хто стрымае меч свой ад крыві. Ты, уладарны кароль, не павінен стрымацца ад меча і агню».

Гэта той самы Урбан VIII, які прапаноўваў чацвертаваць усіх запарожскіх казакоў, і гэта той-жа самы Урбан VIII, які з пачуцця жаласці забараніў бойкі быкоў. Як відаць, бугаі каштавалі для папы больш за ўкраінцаў і беларусоў.

Следства і суд пад старшынством Льва Сапегі прайшлі з незвычайнай паспешлівасцю, а іменна ў тры дні. Суддзі баяліся казакоў, якія абяцалі віцеблянам дапамогу. З прысуду відаць, што ў забойстве ўдзельнічалі не толькі без малага ўсе віцебляне, але і жыхары Оршы, Полацка, Магілева і нават Вільні. Суд прыгаварыў да кары смерцю 114 чалавек. Сцялі галаву толькі дваццаці, бо большасць паспела ўцячы — хто ў Маскоўшчыну, а хто ў Запарожскую Сеч. Горад пазбавілі Магдэбургскага права і ўсіх раней дараваных каралёўскіх прывілеяў. «А так, як, — гаворыцца ў прысудзе, — паўстанне пачалося па сігналу ратушнага і царкоўных званоў, дык загадваем віцебскаму ваяводзічу разбурыць ратушу, разбіць усе гэтыя званы і адлітаваць з іх адзін звон з надпісам аб злачынстве».

У 1772 годзе Віцебск, нарэшце, далучаецца да Расіі і далейшы лёс яго звязан з яе гісторыяй. Праз сорак год пасля далучэння горад вельмі пацярпеў ад Вялікай арміі Напалеона і насельніцтва яго зменшылася ў чатыры разы. Барклай дэ-Толлі, пад прымусам бяздарных прыдворных колаў, рыхтаваўся, не гледзячы на слабасць сваёй арміі, даць пад Віцебскам генеральны бой, але атрымаўшы данясенне ад Багратыёна, што той накіраваўся да Смаленска, таксама адступіў. Пакуль прышло гэта данясенне, пад Віцебскам меў месца ўпарты трохдзённы ар'ергардны бой. Аб гэтай упартасці сведчыць загад генерала Остэрмана-Талстога свайму корпусу, атакаванаму непараўнальна мацнейшым праціўнікам «Стаяць і паміраць!».

Сам Віцебск сустрэў 16 ліпеня Вялікую армію вельмі непрыязна. Французы ў сваіх успамінах неаднакраць падкрэсліваюць гэтую непрыязнь, асабліва прыкметную пры параўнанні з цёплай сустрэчай іх у Вільні. Існуе паданне, што калі Напалеон уязджаў у горад, невядомыя, добра апранутыя, прыгожыя жанчыны пачалі кідаць яму пад ногі кветкі. Маршалы ветліва ўсміхаліся гасцінным віцеблянкам, але імператар чамусьці загадаў затрымаць іх. Потым высветлілася, што жанчыны з дэманстрацыйнай мэтай абсыпалі Напалеона кветкамі. Дробныя чырвоныя гваздзікі нагадвалі кроплі крыві. Здавалася, што імператар уязджае ў горад па залітай крывёю зямлі і сам увесь—ад гістарычнай сваёй трохвуголкі да батфортаў — пакрыты ёю.

Напалеон спыніўся ў генерал-губернатарскім палацы, дзе цяпер змяшчаецца горсовет, і сказаў Мюрату: «Я тут спынюся, азнаёмлюся з мясцовасцю, злучу карпусы сваёй арміі і ўпарадкую Польшчу. 1813 год убачыць мяне ў Маскве, 1814 год у Пецярбургу». А салдаты Напалеона, якія ўжо ідучы на Маскву галадавалі, ледзь толькі ўвайшоўшы ў Віцебск, пачалі марадзёрнічаць.

Акрамя марадзёраў, яшчэ шматлікія падаткі навaліліся на плечы віцеблян. Але асабліва ўзброіла іх супроць Вялікай арміі тое, што ўперадзе яе прышлі польскія ўланы, якія выхваляліся абяцанкай імператара аддадзіць Польшчу ад Кракава да Віцебска. Таму нават віцебскі інтэндант маркіз Пасторэ, калі Напалеон, накіроўваючыся пасля двухтыднёвага раздумвання да Масквы, сказаў яму: — Глядзіце на Беларусь, як на саюзніцу, а не як на заваяваную краіну,—вельмі здзівіўся.

На гэтыя словы беларускі народ адказаў такім шырокім партызанскім рухам, што французы атоесамлівалі яго з партызанскім рухам іспанскага народа. Калі 24 кастрычніка рускі атрад генерала Гарне пачаў з боем займаць горад, віцебляне пагасілі падпалены мост і, узброеныя толькі сякерамі, напалі на французаў з тылу, прымусіўшы тых уцякаць. Апошні свой кавалак хлеба яны аддалі барадатым ноўгарадскім ратнікам, якія ўваходзілі ў Віцебск.

Перад будынкам Віцебскага горсовета стаіць высокі гранітны абеліск. На ім надпіс: «Бессмертной доблести героев отечественной войны», па кутах яго — адабраныя ў чужаземных захопнікаў гарматы. Ён нам каштоўны, гэты помнік — сведка нашай народнай славы.

На працягу амаль стагоддзя Віцебск уяўляе з сябе тыповы губернскі горад рысы яўрэйскай аселасці. Над пахілымі хатамі ўзвышаліся побач з камяніцамі віцебскіх тузоў званіцы трыццаці цэркваў і двух касцёлаў. Сваім гулам яны адгукаліся на ўсе больш-менш значныя падзеі ў жыцці імперыі. А ў пахілых хатах у галечы нараджаліся, жылі і паміралі людзі. Пісьменнік Лажэчнікаў, які ў 40-х гадах XIX стагоддзя губернатарстваваў у Віцебску, піша, што нідзе раней ён не бачыў столькі жабракоў, столькі абдзёртых і галодных. Губернатар, адзначаючы далей, што «дежурный дворянского клуба должен открывать бал польским вальсом, затем надлежит танцовать французскую кадриль, мазурку и в заключение котильон» — зразумела, і не збіраўся зніштажаць жабрацтва. Адзеўшы пэўную колькасць раздзетых у арыштанцкія коты, накарміўшы пэўную колькасць галодных турэмнай пахлёбкай, ён выехаў, прысвяціўшы ім у дадатак рад гнусных антысеміцкіх вершаў. Адзець усіх раздзетых, накарміць усіх галодных мог толькі той вялікі клас, які сам хадзіў раздзетым і галодным і які пачаў нараджацца ў Віцебску на рубяжы двух стагоддзяў.

Губернскі Віцебск, дзе, з аднаго боку, жылі губернатар і архірэй, чыноўнікі ўсіх рангаў і папы ўсіх культаў, купцы і домаўласнікі, гарадавыя і жандары, налічваў, з другога боку, вялікую колькасць саматужнікаў. Гэта, іменна, апошнім належалі пахілыя хаты, над дзвярмі якіх можна было часам пабачыць шыльду: «Тут з двух парваных панчох робяць адну новую» — а з глыбіні поўцёмнага вакна пачуць старую сумную песню панчошніц:

Дзе ты, куля, агнявая куля?
Кліча цябе Рыва, бедная Рыва.
Ой, хай заб'е яго матку куля,
Яна адгаварыла майго жаніха...

Пераважная большасць саматужнікаў працавала на розных купцоў. Асабліва характэрны Орман, які называў сябе панчошным каралём. Кожны дзень каля яго канторы тоўпілася шмат людзей. Яны працавалі дома: у Ормана атрымлівалі ніткі, а яму аддавалі панчохі. Нішто не спыняла работу прыказчыкаў—ні гоман соцень галасоў, ні плач жанчыны, якая тлумачыла, што:

— Нахай бог пакарае багатага рэб Ормана, як рэб Орман пакарае бедную ўдаву Песю-Брайну і яе сем дзяцей. Ён загадаў вылічыць з мяне цэлых дзесяць капеяк! Чуеце, панчошнікі? І за што? На кроплю не сыходзіцца вага ніткаў з вагой панчох...

Жанчына залівалася слязьмі і ніхто яе не суцяшаў. У кожнага, хто толькі прыходзіў да варот крывасмока Ормана, было сваё балючае гора.

У канцы XIX стагоддзя над пахілымі хатамі, акрамя званіц, пачынаюць паяўляцца коміны першых больш-менш буйных фабрык і заводаў. Штодня, ледзь золак, заклікаюць да кабальнай працы былых саматужнікаў і дробных гандляроў, людзей павегра — мяшчанскую і сялянскую беднату гудкі ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна», металаапрацоўчага завода Грынберга, махорачнай фабрыкі Калбаноўскага і іншых. Для гэтай працы асабліва характэрна праца на фабрыцы «Дзвіна». Прадстаўнікі бельгійскага акцыянернага таварыства, якому належала фабрыка, адчувалі сябе ў Віцебску, па іх уласных словах:

«Таксама, як у Конга».

Сапраўды, мелі месца выпадкі, калі работніцы, сыходзячы крывёю, раджалі ў цэхавых прыбіральнях. Дзяцей прыносілі карміць да банкаброшаў і кардаў, і калі маткі паспешна прыціскалі іх да грудзей, ганялі, білі матак плёткай. Падрастаючы, з дзесяці год дзеці прыходзілі на фабрыку працаваць побач з бацькамі. Прыгожых дзяўчат, пад пагрозай звальнення, майстры гвалтавалі. Старыя і пакалечаныя машынамі людзі, бязлітасна выкінутыя за вароты фабрыкі, ішлі жабрачыць да варот Маркава манастыра. Нарэшце, хаваць рабочых дазвалялася толькі на фабрычных могілках, для якіх капіталісты купілі дзесяціну парэзанага канавамі балота. Ад нараджэння ў прыбіральні — да пахавання ў балоце,— так жылі ў праклятым мінулым дзвінцы, так жылі рабочыя заводаў Грынберга, Калбаноўскага, Левінсона і іншых гадаў. Але ўсё-ж Беларусь не Конга, а беларускія рабочыя — не каланіяльныя рабы. Разам з вялікім класам нараджалася яго вялікая партыя.

У 1901 годзе ў Віцебску адбылася першая буйная забастоўка на фабрыцы Калбаноўскага. Прычынай забастоўкі, якой кіравалі іскраўцы, паслужыла жаданне фабрыканта звольніць двух рабочых. Рабочыя выставілі патрабаванне дванаццацігадзіннага рабочага дня і павелічэння зарплаты. Забастоўка ішла пад лозунгам: «Ад 8 да 8», а іменна: працаваць ад 8 гадзін раніцы да 8 вечара. Сімпатыі ўсіх віцебскіх рабочых былі на баку гэтай забастоўкі. Аб ёй гаварылі дома, на заводах, на рынках. Рабочыя трымаліся дружна. Аб іх настроі гаворыць папулярная ў той час песенька на яўрэйскай мове:

Нам трэба ад васьмі да васьмі,
І будзь ты проклят, Арэ Калбаноўскі.
А божа-ж ты мой, злітуйся хто
нада мной,
Ратуйце мяне ад махорачнай
фабрыкі...

Гэтую забастоўку махорачнікі выйгралі, але арганізатары яе былі потым сасланы ў Сібір. З прычыны таго, што рабочыя Віцебска арганізавалі грандыёзныя правады ссылаемых, тэрмін іх ссылкі павялічылі.

Асабліва ярка разгарнуўся рэвалюцыйны рабочы рух у Віцебску, як і па ўсёй краіне, у 1905 годзе. У студзені баставала 500 рабочых у горадзе і 1.500 на фабрыцы «Дзвіна» у Маркаўшчыне, у сакавіку забаставалі прыказчыкі ўсіх магазінаў, у красавіку—панчошніцы. У кастрычніку ў горадзе пачалася агульная забастоўка. Былі барыкады. На вялікай дэманстрацыі рабочых паліцыя забіла 7 і параніла 120 чалавек.

На берагах Віцьбы — у скверы, каля будынка, дзе цяпер змяшчаецца штаб бальшэвікоў Віцебшчыны — абласком партыі, і насупроць, каля тагочаснага рэстарана Брозі, — у пакутах паміралі найлепшыя з віцеблян. Мы ніколі не забудзем і адной кроплі пралітай імі крыві. Пахаванне забітых, у якім удзельнічала больш за 10 тысяч чалавек, вылілася ў яшчэ больш вялікую дэманстрацыю. Удзельнікі пахавання неслі з сабой такую вялізную нянавісць, што насустрач ім не адважыўся выйсці ні адзін жандар.

Забастоўкі і барыкады на адным сацыяльным полюсе Віцебска ўстрасалі другі полюс, але затым ён пачынаў жыць сваім звычайным паразітычным жыццём. На цэнтральных вуліцах рухаўся з хуткасцю балагола пабудаваны бельгійцамі яшчэ у 1898 годзе трамвай. Ён на жаданню сваіх раскормленых пасажыраў спыняецца ў любым месцы і не адважваецца перагнаць архірэйскую карэту.

У карэце едзе архіепіскап князь Уладзімір Пуцята — ў былым гвардзейскі афіцэр і картачны шулер. Яго добра ведае ўся Полацкая епархія, як аматара пахабных анекдотаў і распусніка. Цяпер Пуцята едзе «маліцца» ў жаночы манастыр.

Да гімназіі імя Александра Першага ідуць гімназісты. На кожную сотню іх прыходзіцца 60 дваранскіх сынкоў, 30 купецкіх, 5 папоўскіх, 2 кулацкіх — і ні аднаго сына рабочага. Гэтыя лобатрасы не спяшаюцца — іх цікавіць не навука, а віцебскія «ілюзіёны»—кінушкі, у якіх, паводле афішаў, днямі паказваюцца фільмы «За слушчаным занавесам» і «Скачок са званіцы».

Побач з гімназістамі ідуць да духоўнай семінарыі паповічы-бурсакі. Праз пэўны час яны папамі распаўзуцца па ўсіх кутах губерні, як найлепшыя стражнікі царызма.

Па вуліцах, у розных напрамках, ідуць і едуць рознамасныя прадстаўнікі 5.855 дваран, 267 папоў, 928 купцоў, 1.173 «пачэсных» грамадзян. На чале ўсёй гэтай драпежніцкай зграі стаіць віцебскі губернатар барон Гершаў-Флотаў. Крыху пазней ён «трагічна» загіне ў нецвярозым выглядзе ў прыбіральні. Тады яму на змену прыдзе такі-ж п'яніца — буйны памешчык, пагромшчык Арцымовіч. І гэтае асяроддзе, ад якога ў апошні час яго жыцця смярдзела трупам і якое ўсё-ж без заўзятай барацьбы не здавалася, ахоўваюць паліцыя, жандармерыя казацкая сотня і чорнасоценнае афіцэр'е Закатальскага пяхотнага палка.

Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ўскалыхнула губернскі Віцебск больш, чым калі-небудзь раней. Тады, каб захаваць ўсіх тых трутнёў, што ў ім засталіся, прышлі на змену жандарам і гарадавым іх старыя знаёмыя па гандлю рабочым класам—меншавікі, бундаўцы і рознакаляровая іншая погань. Якіх толькі сацыял-здраднікаў не бачылі віцебскія рабочыя паміж Лютым і Кастрычнікам! Пэўнай часткі гэтых рабочых з прычыны слаба яшчэ развітай класавай самасвядомасці, спачатку цяжка было разабрацца ў тым, што хавалася за «рэвалюцыйнай» вопраткай меншавікоў і бундаўцаў. Іх бянтэжыла тая акалічнасць, што бальшэвікі заклікалі да далейшай барацьбы — «да рэвалюцыі ў 1.000 разоў мацнейшай за лютаўскую». (Ленін)*), у той час як сацыял-здраднікі без усякай барацьбы абяцалі малочныя рэкі ў кісельных берагах. Таму меншавіцкі лідэр Абрамовіч (Рэйн) са задавальненнем гаварыў: «У Віцебску наша партыя карыстаецца вялікай пашанай. Бальшэвікоў тут зусім не чуваць». І як гад хлусіў!

У Віцебску ў той час працаваў верны саратнік вялікага Сталіна, тады салдат царскай арміі, а цяпер сталінскі нарком—жалезны чэкіст таварыш Нікалай Іванавіч Ежоў. Таварыш Ежоў праводзіў вялікую падпольную арганізацыйную работу сярод пяцідзесяцітысячнага тады віцебскага гарнізона наладжваў шчыльную сувязь паміж гэтым гарнізонам і віцебскімі рабочымі. А для агідных сацыял-ішчэек капіталізма ён заставаўся звычайным салдатам, які ў 5-ай артылерыйскай паўчынай майстэрні рамантуе пакалечаныя пад Дзвінскам гарматы і падкоўвае артылерыйскіх коней. Апранутыя ў салдацкія шынялі рускія рабочыя на чале з вялікім сынам вялікага рускага народа таварышам Ежовым садзейнічалі хуткаму бальшэвізаванню беларускіх рабочых.

У часе выбарчай кампаніі ва Устаноўчы Сход рабочыя далі рашучую бойку сваім ворагам. Калі Абрамовіч, прыехаўшы на «Дзвіну», скончыў сваю прамову заклікам галасаваць за меншавікоў, работніцы сцягнулі яго з трыбуны і выгналі з фабрыкі. У дзень выбараў без малага ўсе віцебскія рабочыя аддалі свае галасы бальшэвікам. Яны зрабілі гэта так дружна, свядома-рэвалюцыйна і дэманстрацыйна, што прывялі ў невыказнае абурэнне сацыял-здраднікаў. Віцебляне галасавалі за бальшэвіцкі спіс № 5, які ад Віцебскай губерні ўзначальваў нязломны бальшэвік, рыцар пралетарскай рэвалюцыі Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі.

У віцебскім аблархіве асабліва беражліва ахоўваецца гістарычны дакумент:

«Заявление.

Я, нижеподписавшийся, сим изъявляю согласие баллотироваться в Учредительное Собрание по Витебскому Избирательному Округу и не возражаю против порядка помещения в списке, предложенном Витебской организацией РСДРП (большевиков).

Адрес: Петроград, Кавалергардская, 22, кв. 17.

Феликс Эдмундович ДЗЕРЖИНСКИЙ».

Цяпер, калі працоўныя Віцебска радасна рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўны Совет сваёй ордананоснай рэспублікі, яны з гонарам успамінаюць імя свайго першага вялікага дэпутата.

Напярэдадні Кастрычніка віцебскія бальшэвікі пад кіраўніцтвам таварыша Ежова вялі агітацыю сярод карнілаўскіх эшалонаў, якія ішлі з Магілева на Петраград. Невялікага росту, малады салдат гаварыў тэкінцам аб іх прыгожай радзіме, з якой толькі бальшэвікі знімуць кайданы, гаварыў казакам аб Ціхім Доне, які парадзіў калісьці Сцяпана Разіна і Емельяна Пугачова. Шмат тэкінцаў і казакаў далей Віцебска не пайшлі.

І хто здолее сёння вымераць усю глыбіню радасці віцеблян, калі яны даведаліся, што таварыш Нікалай Іванавіч Ежоў, які калісьці згуртоўваў у Віцебску сілы гераічнай партыі бальшэвікоў, даў згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР ад Ленінскай выбарчай акругі Віцебска. Як адзін, прыдуць яны ў святочны дзень 26 чэрвеня да урнаў і ад шчырага, удзячнага сэрца аддадуць свае галасы за вернага саратніка вялікага Сталіна.

Вялікая сацыялістычная рэвалюцыя, зробленая ў кастрычніку 1917 года гераічным рускім пралетарыятам пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, вызваліла беларускі народ ад шматвяковага ўціску. Вялікі Кастрычнік з'яўляецца самай яркай старонкай у тысячагадовай гісторыі Віцебска, калі назаўсёды памерла беларуская прыказка: «Кепска каля Віцебска».

Непазнавальна змяніўся Віцебск за дваццаць год. Ён не ведаў ні нямецкай, ні польскай акупацыі і ён іх ніколі, як і кожная пядзь зямлі нашай вялікай радзімы, не будзе ўжо ведаць. Адразу пасля Кастрычніка сярод віцебскага гарнізона і віцебскіх рабочых пачаўся ўзначальваемы таварышам Ежовым запіс у Чырвоную Армію. Штодня запісвалася ад 50 да 100 чалавек.

Шмат віцебскіх рабочых побач з рабочымі і працоўнымі братніх народаў загінулі на франтах грамадзянскай вайны — пад Перакопам і Варшавай, пад Валачаеўкай і Царыцыным. «Прыемна і радасна ведаць, што кроў, густа пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма» — сказаў вялікі правадыр, настаўнік і бацька таварыш Сталін. Аб геніяльнай мудрасці правадыра сведчыць кожны горад і кожны калгас нашай цудоўнай радзімы, аб гэтым сведчыць і Віцебск.

За час двух сталінскіх пяцігодак у горадзе пабудавана 15 буйных прадпрыемстваў. Нават для беглага азнаямлення з імі не хопіць летняга дня, але досыць прайсціся па вуліцах былой Маркаўшчыны, а цяпер Пролетарскай Слабады, каб адчуць вялікую незвычайнасць новага Віцебска.

Здаецца, з аднаго шкла пабудавана панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ». Калі былы вязень Моабіта, таварыш Макс Гельц аглядаў яе светлыя, сонечныя карпусы, ён са слязьмі на вачах заўважыў: «Так, варта было за гэта змагацца». Фабрыка з'яўляецца самым буйным па колькасці рабочых прадпрыемствам Совецкай Беларусі. Любы з яе цэхаў больш шматлюдны, чым насельніцтва такіх былых мястэчак, як Лёзна, Янавічы, Астроўна. Яна ўвабрала ў сябе местачковых саматужнікаў і вясковую моладзь. Тут сустрэлі сваю шчаслівую старасць Песі-Брайны і тут шчаслівай моладзі невядома песня пра бедную Рыву.

Перабудавана і пашырана саракагадовая «Дзвіна», цяпер фабрыка імя Л. М. Кагановіча. Калі старыя дзвінцы пачынаюць расказваць дзецям пра сваё мінулае, дык тыя ўспрымаюць праклятую былую сапраўднасць, ад якой на бацькоўскіх спінах засталіся пісягі, як жудаснае паданне. Гэта здаецца ім далёкім паданнем тым больш, што іменна з маладых ватэршчыц і стаханавак былой «Дзвіны» паходзіць віцебскі дэпутат Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР Ольга Ефімаўна Багачова.

Назаўсёды змоўклі званы цэркваў і касцёлаў. У горадзе цяпер 92 бібліятэкі і 32 рабочыя клубы, 8 тысяч студэнтаў і 22 тысячы школьнікаў. Варта толькі зірнуць на моладзь, што спяшаецца да дзвярэй адной з чатырох віцебскіх вышэйшых навучальных устаноў—педінстытута імя С. М. Кірава, каб пераканацца, што яна—плоць ад плоці працоўных. Насустрач ёй усміхаецца з партрэта над дзвярмі неўміручы у нашых сэрцах і нашай працы правадыр-трыбун і здаецца, гаворыць:

— Чорт вазьмі, калі па-чалавечаму сказаць, як хочацца жыць і жыць!».

Назаўсёды змоўклі званы, якія калісьці заклікалі народ да барацьбы, а потым хавалі яго ў магілу жывым. Калі вы ўвечары выйдзеце на Чырвоную Горку, якая пануе над усім горадам і на якой калісьці гаралская беднота цягнула труп забітага ёю архіката шляхецкай Польшчы, — вас ахутае сімфонія новага Віцебска. Яе складаюць гудкі новых і перабудаваных старых прадпрыемстваў, дзесяткі комінаў якіх высяцца над горадам. У ёй удзельнічаюць гіганты першай пяцігодкі — швейны «Сцяг індустрыялізацыі» і панчошна-трыкатажны «КІМ», алейны завод і шчоткамбінат, удзельнічаюць «Чырвоны металіст» і абутковая фабрыка «Чырвоны Кастрычнік», металаапрацоўчы «Комінтэрн» і швейная «Профінтэрн», панчошная фабрыка імя Клары Цэткін і акулярная імя Розы Люксембург, лесазавод імя «Праўды» і фанерзавод імя «Звязды», голкавы, махорачная і шмат іншых.

Трыццаць тысяч віцебскіх рабочых скончылі рабочы дзень. За гэты дзень яны далі сацыялістычнай краіне на чвэрць мільёна рублёў швейных вырабаў і чвэрць мільёна пар панчох, тры мільёны штук голак і чвэрць мільёна штук цэглы, пяць тысяч пар абутку і вагон дрожджаў, пяцьдзесят тысяч штук трыкатажных вырабаў і дзве тысячы скрынак махоркі. Яны далі сацыялістычнай краіне станкі і прадзіва, біноклі і акуляры, лес і фанеру, шчацціну і лямец, мэблю і люстры, алей і піва.

Совецкі Віцебск скончыў працоўны дзень. З фабрычных і заводскіх варот выходзяць на вуліцы роднага, прыгожага, любімага горада яго гаспадар — жывы, вясёлы, стаханаўскі рабочы народ.



Віцебск. Плац імя Леніна.

*) Ленінскі зборнік, IV, стар. 290.

Гастролі Маскоўскага тэатра Рэвалюцыі ў Менску

СПЕКТАКЛЬ АБ ВЯЛІКАЙ ПРАЎДЗЕ ЛЕНІНА і СТАЛІНА

Украінскі селянін-бядняк Тарас Галота доўга ў сваім жыцці шукаў праўду. Ен шукаў яе ў акопах імперыялістычнай вайны, куды яго, як «гарматнае мяса», загнала самаўладства. Ен шукаў яе ў ашуканчых абяцаннях часовага ўрада Керэнскага, які ў імя сваіх інтарэсаў зваў на «вайну да пераможнага канца». Ен шукаў яе ў сваёй роднай вёсцы, уцёкшы з фронта.

«Казалі, зямлю дадуць, свабода! — ашукалі. Пачалі мы самі, панскае поле мералі, мералі ўрачыста, песні спявалі пра свабоду, потым пайшлі па панскі хлеб, а ўвечары прыехала камісія з горада, казакі... Нейкі панок-рэвалюцыянер доўга гаварыў людзям нашым пра свабоду... А потым казакі білі цалую ноч. Моцна білі. На досвітку я прыглушыў вартавога і ўцёк» — так расказвае ён сам піцерскаму пролетарыю Кузьму Рыжову, з якім выпадкова пазнаёміўся на маленькай чыгуначнай станцыі. Цяпер Тарас ідзе шукаць праўды ў далёкай Сібіры, добра ведаючы, што адтуль назад ужо ніхто не вяртаецца, там і паміраюць, знячыцца, там лепш. Цяпер ужо ў свядомасці Тараса складаецца цвёрдае пераканание аб тым, што «праўды няма»: «рэвалюцыянеры для сябе цара скінулі, а нас, мужыкоў, прадалі, падлюгі, панам»...

І вось з такім Тарасам, які пазнаў ужо першыя зерні праўды, знаёміцца на сцэне большэвік Рыжоў, знаёміцца глядач. Артыст І. Г. Агейчэнкаў, дзякуючы глыбокаму пранікненню ў роль, вельмі праўдзіва раскрывае вобраз Тараса, мастацка абагульняючы ў ім найбольш тыповыя і характэрныя рысы вясковай беднаты напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі. Не можа не застацца ў памяці гледача, калі Тарас, расказваючы Кузьму аб сваіх пакутах на фронце, дастае з кішэні і паказвае яму «доблесць рускага салдата» — георгіеўскі крыж. «Думаў прадаць, дык ніхто не купляе... Кавалка хлеба за яго ніхто не дае»...

А ў наступных карцінах, у Петраградзе, куды прыязджае Тарас, мы з напружанай цікавасцю сочым, як ён становіцца на шлях пролетарскай рэволюцыі, як ён знаходзіць вялікую большэвіцкую праўду, актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы Кастрычніцкага ўзброенага паўстання і, нарэшце, сустрэўшыся з найвялікшым геніем чалавецтва Леніным, уступае ў партыю большэвікоў.

Так праз усе падзеі, паказаныя ў п'есе, праходзіць жыццё шукальніка праўды, бедняка Тараса Галоты. Аднак, у спектаклі ён не падаецца як самадаўлеючы герой, як нейкі цэнтр, ад якога ў пэўнай залежнасці знаходзяцца астатнія дзеючыя асобы. Наадварот, — артыст Агейчэнкаў вельмі ўмела, з вялікім мастацкім тактам знаходзіць якраз такія ракурсы, якія не высоўваюць Тараса ў спектаклі «буйным планам», а характарызуюць сутнасць падзей, раскрываюць незабыўныя старонкі нашай гісторыі і найбольш ярка падкрэсліваюць велічнасць правадыроў і кіраўнікоў соцыялістычнай рэволюцыі. І ў гэтым — у імкненні перадаць гістарычную атмасферу падзей — заслуга не толькі аднаго Агейчэнкава. У гэтым вялікая ўдача ўсяго акторскага калектыва і, у прыватнасці, пастаноўшчыка спектакля — заслужанага дзеяча мастацтваў Н. Пятрова.

Надзвычай трапнымі, тыповымі рысамі надзяляюць свае вобразы акторы А. І. Шчагін (Кузьма Рыжоў), С. В. Разумаў (Вася), Т. Д. Салаўёў, (аўроравец), С. А. Лаўрэнцеў і В. І. Лебедзеў (салдаты, якія чытаюць пісьма з дому), Н. П. Мураўёў (пракурор). І асабліва неабходна адзначыць бліскучую ігру заслужанага артыста рэспублікі Н. Ф. Астангава ў ролі Керэнскага, гэтага «усерасійскага экспромта», марыянеткі ў руках сваіх міністраў, у руках буржуазіі.

«Праўда» у тэатры Рэволюцыі — спектакль аб Кастрычніку, аб гераічнай партыі большэвікоў і аб вялікім Леніне, як арганізатару і кіраўніку Кастрычніцкага паўстання, — з першых-жа карцін захапляе гледача сваёй праўдзівасцю. З першых карцін глядач бачыць, як па шляху да праўды ідзе не адзін Тарас Галота, як гэтую праўду большэвіцкай партыі, праўду Леніна і Сталіна пролетарыят заваёўвае са зброяй у руках, як гэтая магутная сіла праўды, наперакор меншавіцкім, эсэраўскім дэмагогам, наперакор здраднікам рабочага класа — трацкістам і зіноўеўцам, згуртоўвае вакол Леніна, вакол большэвікоў усё большыя масы працоўных, усім сэрцам адчуваючых, што праўда — гэта Ленін.

Вось чаму мы ўжо з першых карцін адчуваем блізкую прысутнасць між усёй масы рабочых, матросаў, салдатаў, якія дзейнічаюць у спектаклі, і між нас, хто сядзіць у зале, вобраза вялікага Леніна. Гэтае арганічнае ўспрыняцце гледачом эмоцый актораў як сваіх уласных пачуццяў — лепшае сцвярджэнне рэалістычнай сілы спектакля.

Не гледзячы на тое, што падзеі ў Смольным паказваюцца толькі ў фінальных карцінах, глядач праз увесь спектакль адчувае, бачыць у дзеі Владзіміра Ільіча, адчувае яго кіруючую, арганізуючую ролю, і яго паяўленне на сцэне дае гледачу як-бы толькі фізічнае ўяўленне аб жывым Леніне, дапаўняе вобраз, які склаўся ў кожнага з нас, жыве ў народзе, у яго песнях і паданнях.

Вялікае шчасце выконваць ролю Леніна выпала на долю нямногіх майстроў нашага тэатра. І іх поспех, іх творчая перамога — гонар усіх работнікаў совецкай сцэны. Усё совецкае мастацтва радуецца іх перамозе і асабліва перамозе заслужанага артыста рэспублікі М. М. Штрауха, які між створаных майстрамі совецкага мастацтва сцэнічных вобразаў Владзіміра Ільіча Леніна даў адзін з лепшых вобразаў.

Праўда, драматург перадае вобраз Леніна занадта лаканічна і не дае выканаўцу шырокага драматургічнага матэрыялу, але ў гэтым ёсць і тая дадатная акалічнасць, што Ленін не ператвараецца ў сюжэтны персанаж, а вырастае ў мануманьтальны вобраз правадыра.

Самім жыццём у вобразе Леніна ўвасоблена вялікая праўда і сапраўднае хараство. Ен сам быў, па выразу Горкага, «нібы твор класічнага мастацтва». «Ен просты, як праўда» — сказаў аб ім стары сормаўскі рабочы. Таму ў памяці гледача надоўга застануцца рысы вобраза генія рэволюцыі, якія ўдалося перадаць тав. Штрауху. Артыст паказвае Леніна ў самы напружаны момант Кастрычніцкага выступлення — перад узяццем Зімняга палаца. Перад намі — вялікі стратэг рэволюцыі, які глыбока ўпэўнены ў сваёй перамозе, ведае, што яна блізка. Ен упэўнены ў перамозе, але не забывае, што яе трэба арганізаваць. І ён сам асабіста кіруе выступленнем, аддае распараджэнні, гутарыць з салдатамі.

Калі Ленін паяўляецца ў пакоі дзяжурных сувязістаў Смольнага і, незаўважаемы абкружаючымі, спакойна ідзе да стала, — глядач нібы губляецца. Ен гэтага паяўлення чакаў увесь спектакль, а здарылася яно як-бы зусім нечакана, у самай «непадыходзячай» абстаноўцы. Але гэта адно імгненне. У зале — доўга не сціхаючая авацыя, быццам ён прышоў да нас, у наша жыццё «как живой с живыми говоря», самы блізкі таварыш.

Вось Ленін пазнае токара Кузьму Рыжова. «Вы на першым Усерасійскім з'ездзе выступалі прада мной? Добра выступалі» — гаворыць ён яму, гаворыць, як таварыш, які пазнаў свайго блізкага чалавека. І з Тарасам гаворыць ён як таварыш. Якая невычарпальная цікавасць да людзей. Ен распытвае Тараса аб вёсцы, аб эсэрах. Ен рад гэтай сустрэчы, якая, мусіць, дала яму нейкія новыя факты, новы матэрыял. І гэта сцэна пакідае незабыўнае ўражанне, асабліва, калі Ленін дае Тарасу рэкамендацыю ў партыю. Тут артыст перадае асобныя рысы Леніна — чалавека і стратэга, раскрываючы вобраз мудрага правадыра і роднага чалавека. А колькі задушэўнага пачуцця і шчырасці ўкладае Штраух у сцэну гутаркі Леніна з таварышам Сталіным па тэлефону. Гэта гутарка баявых спадвіжнікаў, з'яднаных дзесяцігоддзямі рэволюцыйнай барацьбы, і выказаныя ў ёй выключнае давер'е і любоў Владзіміра Ільіча да таварыша Сталіна ўваходзяць у наша сэрца лепшымі пачуццямі, гордасцю за сваю бацькаўшчыну, за любімага правадыра народаў Совецкага Саюза і працоўных усяго свету Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Таму зала з напружанай увагай сочыць за кожным крокам артыста, за кожным яго словам, таму што глядач успрымае ўнутранае жыццё Леніна, бачыць і адчувае ленінскую мудрасць, ленінскую мысль.

П'еса канчаецца сцэнай у Смольным, дзе Ленін выступае на Другім з'ездзе Советаў. Ен гаворыць:

«Таварышы! Рабочая і сялянская рэволюцыя, аб неабходнасці якой увесь час гаварылі большэвікі, адбылася!..»

Так, рэволюцыя адбылася. Шчаслівы совецкі народ адсвяткаваў ужо яе слаўнае дваццацігоддзе. І сэрцы гледачоў напаўняюцца невыказнай радасцю, бо мы ведаем, што ў вялікай Сталінскай Канстытуцыі ўвасоблена магутная сіла ленінскай праўды, якая яркім сонцам будзе асвятляць шлях чалавецтву.

Ц. КРЫСЬКО.

РАБОТА НАД ВОБРАЗАМ В. І. ЛЕНІНА

Гутарка з заслужаным артыстам рэспублікі М. М. ШТРАУХ

Совецкі глядач горача і ўдзячна прымае спектакль, дзе ўпершыню выведзен вобраз Владзіміра Ільіча Леніна. Але было-б няправільным думаць, што на гэтым можна супакоіцца і лічыць работу, хоць-бы ў аддаленай ступені, закончанай. Праблема стварэння вобраза Леніна ў мастацтве — гэта справа не аднаго актора, ці нават аднаго тэатра, — гэта справа пакаленняў. Зараз можна гаварыць аб нейкіх першых, надзвычай скромных спробах, аб першых, вельмі папярэдніх эскізах, якія ўсё-ж вельмі патрэбныя, бо яны паслужаць асновай для далейшай работы па стварэнню помніка генію Леніна ў мастацтве.

Стварэнне вобраза Леніна ў тэатры шчыльна звязана з агульнай праблемай стварэння вобраза совецкага станоўчага героя. Быў час, калі нашым аўтарам удаваліся больш так-званыя «адмоўныя персанажы». Актору, якому прадстаяла іграць ролю «станоўчага героя», было вядома, што тэкст ролі будзе халульным, ісціны — прапіснымі, персанаж атрымаецца картонным. Апошнія годы совецкія драматургі і совецкія акторы шмат папрацавалі над стварэннем вобраза совецкага героя. Без гэтай велізарнай работы немагчыма было стварэнне, напрыклад, Чапаева ў кіно, немагчыма была-б нават думка аб стварэнні вобраза Леніна, бо вобраз Леніна — гэта абагульненне і сінтэз станоўчага героя-правадыра.

Упачатку, калі я прыступіў да работы над вобразам, я паставіў перад сабой задачу: праўдзіва, з найбольш мастацкім тактам і скромнасцю паказаць Леніна, тварца Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі. І калі глядач натхнёна прыняў спектакль, я зразумеў, што зараз можна больш смела прадоўжваць работу над стварэннем вобраза Леніна. Тэатр набыў творчую ўпэўненасць у рабоце.

Эволюцыю гэтага творчага ўдасканалення можна прасачыць на пяці першых спектаклях, прысвечаных XX-годдзю Кастрычніка. Калі ў «Зямлі» Вірта драматург Леніна не паказвае, але



Засл. арт. рэсп. **М. М. Штраух** у ролі В. І. Леніна.
Зарысоўка **А. Кастамалоцкага.**

гаворыць, што Ленін павінен усім ходам падзей п'есы адчувацца і быццам нябачна прысутнічаць, то Трэнёў выступае некалькі смялей: ён паказвае вобраз Владзіміра Ільіча ў п'есе «На берагах Нявы», але не дае яму ні слова. Карнейчук у «Праўдзе» аказаўся яшчэ больш смелым: даў Леніну тэкст і вывеў у двух эпізодах. Самым храбрым аказаўся Пагодзін, які паказаў вобраз Леніна ў трох сцэнах п'есы «Чалавек з ружжом», драматургічна яшчэ больш поўнацэнна.

Тав. Штрауху асабліва цяжка было сыграць вобраз Леніна таму, што ён Леніна ні разу не бачыў і не чуў. Часу для работы было вельмі мала, каля двух месяцаў. Ен гутарыў з людзьмі, асабіста ведаўшымі Леніна, глядзеў кінофільмы і фатаграфіі, шмат разоў наведваў музей Леніна, вывучаў вобраз у жывапісу, у графіцы, у скульптуры і ў паэзіі. Ен з галавой увайшоў у літаратуру аб Леніне — і не толькі аб Леніне. Штраух чытаў біяграфіі рэволюцыянераў-большэвікоў, таму што і ў іх адлюстроўваецца Ленін.

Асноўнай крыніцай яго работы над вобразам была сталінская прамова аб Леніне, сказаная ім на вечары крэмлёўскіх курсантаў у 1924 годзе. Гэта лепшае і найбольш глыбокае раскрыццё ленінскага вобраза.

Тое, што Ленін умеў жыць задачамі сёнешняга дня і адначасова заглядваць у будучае і прадбачыць яго, дало актору Штрауху адчуванне маштабу ролі. У сцэнах «У Смольным» ён жыў задачамі захопу ўлады і думаў адначасова аб дэкрэтах аб міры і зямлі, прадугадваючы контуры будучага соцыялістычнага грамадства.

У пластычным вобразе Владзіміра Ільіча актор імкнуўся дамагчыся максімальнага падабенства. Важна было стварыць абліччя такім, якім яно жыве ў сазнанні мас.

— Для ўсіх нас, — гаворыць у заключэнне тав. Штраух, — для пастаноўшчыка Н. Пятрова, для групы актораў, занятых у сцэнах «У Смольным», і для ўсяго тэатра работа над вобразам Леніна была сур'ёзным мастацкім і палітычным выпрабаваннем.

ЯК Я ІГРАЮ КЕРЭНСКАГА

Гутарка з засл. арт. рэсп. Н. Ф. АСТАНГАВЫМ

Працуючы над роллю Керэнскага, я імкнуўся пазбегнуць карыкатуры. Няма нашто шаржыраваць тое, што ў нашым уяўленні ў самім жыцці прадстаўляе шарж на чалавека. Рабіць-жа Керэнскага дэгенератам, як мне прапаноўвалі некаторыя людзі, — азначала ўпасці ў вульгарызацыю. Я ўсяляк гэтага пазбягаў.

Як і ва ўсякай рабоце над роллю, прадстаяла азнаёміцца з гістарычнымі матэрыяламі, асабістымі ўспамінамі людзей, фотадакументамі і інш. Работа затрудзялася тым, што мне асабіста не давялося бачыць у жыцці постаць незадачлівага прэм'ера «ўсёй Русі». З людзей, якія бачылі Керэнскага, мне ўдалося пагаварыць толькі з адным — заслужаным дзеячом мастацтваў Н. В. Пятровым. Гэтага было яўна недастаткова. Тады я звярнуўся да гісторыка-літаратурных крыніц.

Маю ўвагу пры вывучэнні матэрыялаў жандармерыі спыніла клічка «Быстрый», дадзеная ахранкай Керэнскаму. Яна гаварыла аб яго імклівасці, парывістасці, рухавасці.

Разы два я наведаў музей Рэволюцыі ў Маскве. З паказаных фотаматэрыялаў аб Керэнскім неяк асабліва рэзка запамяталіся два здымкі: адзін — Керэнскі ў Стаўцы, ля вагона генерала Аляксеева, другі — Керэнскі ў адзіноце, сядзіць з падабранымі пад сябе нагамі на канапе ў Зімнім палацы. На першым здымку мяне зацікавіў твар. Ен быў адутлаваты, відаць з прычыны хваробы і бяссоніцы. Запамятаваўся вонкавы выгляд: задрыпаны фрэнчык і галіфе надавалі ўбогасць усёй яго постаці. Ва ўсім абліччы адчувалася фіцюлька, якая імкнецца трапіць у Напалеоны, — чалавек без волі, без сілы, які жыве аднымі нервамі.

Гэты здымак вельмі ясна даў мне адчуць усю спешчанасць, надлом, упадачнасць «прэм'ера», адсутнасць у яго характару, тэмпераменту — тое, што вызначаецца адным словам дэкаданс. Для майго ўяўлення гэты здымак даў вельмі багата. Мне стаў зразумелы вялікі поспех Керэнскага ў жанчын, у тых жанчын, для якіх «душка-тэнар» ёсць ідэал мужчыны. Не выпадкова і жанчыны гаварылі аб Керэнскім: «ах, які ён душка». Праз гэтую фатаграфію стала раскрывацца ўнутраная сутнасць Керэнскага.

Яшчэ адна фатаграфія дала мне ўяўленне аб паводзінах «прэм'ера» ў быту. Керэнскі стаіць пад кустом бэзу. У пяцельку фрэнча ўтыркнута кветка бэзу, рука па-напалеонаўску закладзена за спіну, другая трымаецца за борт фрэнча. Стала ясна, што калі нават у быту Керэнскі «працаваў» пад Напалеона, дык гэты жэст быў адным з тых, якія вызначалі яго «позу». Я поўнасцю перанёс яго на сцэну.

У фатаграфіі — Керэнскі ў Стаўцы ў генерала Аляксеева я заўважыў яшчэ яго імкненне захаваць ваенную выпраўку. Ішло гэта ў яго, відаць, ад поўваеннага касцюма, які ён насіў. І гэту дэталь я хачу адлюстраваць на сцэне.

Рукі Керэнскага — у іх ёсць нейкая імклівасць, штосьці ці-то ад актора, ці-то ад аратара-адваката, і ў той-жа час рукі яго нейкія аслабленыя, бяссільныя. Таму ў жэст, якім ён вітаецца, я паспрабаваў унесці і гое і другое. Я падаю руку рэзка выцягнутую наперад (у гэтым ёсць штосьці тэатральнае, разлічанае на эфект) і ў той-жа час яна бязвольна кладзецца зверху на далонь другога чалавека.

Год дзесяць таму назад мне прышлося быць на выстаўцы АХРА. Рэзка застаўся ў маёй памяці партрэт Керэнскага работы Рэпіна. Я бачыў жалкага чалавека, які прымасціўся на краю крэсла з пустымі, бязвольнымі вачыма, — істэрыка, чалавека з хуткай зменай настрою. Іграючы ролю Керэнскага, я адчуваю ўсю праваду вялікага мастака. У сваім грыме я прытрымліваюся гэтага партрэта.

КАНДЫДАТ Ў ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ

Трыццаць год таму назад на адным з перагонаў Рыга-Орлоўскай чыгункі, кілометраў за дзесяць ад станцыі Рагачова, досыць часта можна было бачыць, як амаль да кожнага поезда выходзіў невялікі хлапчук з падкрэслена сур'ёзным тварам, падымаў угору зялёны флажок, прапускаючы поезд, а калі той праходзіў—хлапчук з яшчэ больш сур'ёзным выглядам станавіўся пасярод рэяк і трымаў свой флажок, аж пакуль цягнік не хаваўся за далёкім паваротам. Стаяў ён да таго часу, пакуль маці яго—пераездная старажыха Елена Емельянаўна — адкрывала шлагбаум, давала дарогу сялянскім фурманкам, а потым збірала траву парасёнку ці карове па абочынах дарогі. У галаве хлапчука роіліся думкі, роіліся мары пра той незнаёмы, далёкі, страшны і прывабны свет, адкуль паявіўся і куды знікнуў толькі-што прашоўшы поезд.

Самым шчаслівым чалавекам на свеце Міхась лічыў машыніста, бо той мог ездзіць штодзённа ў гэтае невядомае далёкае, мог сваімі ўласнымі вачыма бачыць тысячы новых людзей і мясцовасцей. І за гэта ў яго не патрабавалі грошай, а нават плацілі яму. І Міхась цвёрда вырашыў, што калі ён падрасце—ён абавязкова стане машыністам. Бацька Міхася—Ціхон Васільевіч—быў тае-ж думкі. З маладых сваіх год адарваўшыся ад вузенькай палоскі, якая не магла пракарміць і чацвертай часткі сваіх гаспадароў, ён усё сваё жыццё прапрацаваў рамонтным рабочым на чыгунках за 12 руб. 40 кап. у месяц. Пасада машыніста і для яго была недасяжнай марай, верхам дабрабыту і шчасця. «Але трэба, мусіць, шмат вучыцца, каб табе даверылі і машыну і людзей»—казаў бацька хлапчуку.

Што азначалі гэтыя словы, Міхась сабе не ўяўляў добра, але старанна бегаў у старасельскую школу, што была за адзін кілометр ад будкі № 230. І тут, у школе, ён набыў новую страсць, якая не менш, чым мары пра поезд і машыніста, захапіла Міхася,—гэта была страсць да літаратуры. Поезд і кніга сталі тым каўром-самалётам, які ўзлымаў малога Міхася Лынькова над цяжкім і непрыглядным жыццём яго сям'і, які разгортваў перад ім панарамы светлага жыцця.

«Больш за ўсё любіў я Гогаля,— успамінае тав. Лынькоў,—і гэта, як відаць, было настолькі падкрэслена, што пры выпуску з школы за добрыя поспехі я атрымаў, як узнагароду, «Ночь перед Рождеством». Сотні разоў перачытваў я прыгоды каваля Вакулы і кожны раз знаходзіў для сябе ўсё новую і новую асалоду ў гэтым падарунку».

Вясковая школа—толькі прыступак, з такой асветы хлеба не есці. Але куды падасіся з сынам, маючы восем душ сям'і—адзін менш другога—і пятнаццаць рублёў жалавання ўдваіх у месяц? Тут нават чатырохкласная «гімназія для кухаркіных дзяцей» з яе васьмірублёвай платай за права навучання здасца царскай раскошай. Шмат разоў прыкідваў Ціхон Васільевіч, якім-бы чынам, не адбіраючы куска хлеба ад меншых дзяцей, вучыць далей свайго «бальшака», але большай магчымасці, як аддаць яго ў Рагачоўскую двухкласную школу, не выдумаў. Аб матэрыяльным дабрабыце сям'і сведчаць дзве лічбы: з васьмі дзяцей Ціхона Лынькова выжыла толькі палова, а калі пасля смерці бацькі і трагічнай гібелі маці (пераездная старажыха трапіла пад поезд) Міхась Ціхонавіч прыняў апеку над застаўшыміся ў жывых трыма малымі, валасныя ўлады засведчылі, што ўсёй маёмасці пасля нябожчыкаў засталося на 45 рублёў.

Зімой у школе, а летам з граблямі і лапатай на рамонце чыгуначнага палатна, у пясчаных кар'ерах, каб зарабіць магчымасць вучыцца,—так жыў падростак Міхась Лынькоў да 1912 года, да сваіх трынаццаці год (нарадзіўся ён у 1899 годзе). Двухкласная школа была практыкавальнай школай пры Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі. Добрыя поспехі і здольнасці Міхася звярнулі на яго ўвагу настаўнікаў, і па сканчэнні школы ён трапляе на першы курс настаўніцкай семінарыі, нават стыпендыятам. Праўда, гэта радасць цягнулася нядоўга. Спатрэбілася стыпендыя для сына начальніка пошты, знаёмага дырэктару, і Міхасю Лынькову адвольна зніжаюцца ацэнкі ведаў, яго пазбаўляюць стыпендыі і інтэрната, з тайнай думкай, што іншагародні, сын рамонтнага рабочага пакіне, як безнадзейную справу, сваю вучобу і пойдзе да бацькі.

Мы ўсе з вялікай пашанай успамінаем народных настаўнікаў, што сеюць «разумное, добрае, вечнае», але настаўнікі для семінарый спецыяльна падбіраліся царскім урадам: ячы павінны былі палачнай дысцыплінай, зуброжкай, муштрой рабіць сваіх выхаванцаў манекенамі, пазбаўленымі ўсякай чалавечай годнасці. Не дзіва, што такія «настаўнікі» маглі выгурыць найлепшага вучня з семінарыі.

Але Лынькоў нездарма паходзіць з сям'і, якая прывыкла змагацца за жыццё. Кватаруючы ў акраінных халупах Рагачова, кормячыся грашовымі ўрокамі зімой і палзённай работай на чыгунцы, аж да работы грузчыкам уключна, летам, — Міхась Лынькоў не кідаў вучобы і ў лютым 1917 года, па сканчэнні семінарыі, атрымаў прызначэнне настаўніка Ліпініцкай сельскай школы Буда-Кашалёўскай воласці.

Сканчэнне семінарыі і рэволюцыя раскавалі душу Лынькова, і мы бачым яго гарачую дзейнасць у глухой вёсцы Ліпінічы па арганізацыі сялян і іх палітычнай асвеце. Спачатку арганізацыя кааператыва, потым арганізацыя адпору нямецкім акупантам, супроць рабаўніцтва якіх стыхійна падымалася сялянства Беларусі. У 1919 годзе Міхась Лынькоў па профсаюзнай мабілізацыі ідзе ў Чырвоную Армію і з 70-м стралковым палком 8-й дывізіі прарабляе ўвесь гераічны паход на Варшаву, Слонім, Ваўкавыск, Брэст-Літоўск, Гарволін, парог Варшавы — вось слаўны шлях 70-га палка.

«Тое, што мы бачылі ў паходзе, — кажа тав. Лынькоў, — напоўніла маё сэрца векавечнай нянавісцю да белапанскай Польшчы: спаленыя ўшчэнт беларускія вёскі, павешаныя жанчыны і падлеткі, непахаваныя афяры расстрэлаў, жудасныя здзекі з яўрэйскага насельніцтва ў мястэчках, — вось што пакідалі за сабой белапольскія бандыты. Усё гэта і зараз стаіць у ваччу і будзіць думку аб помсце».

З 70-палком прарабіў тав. Лынькоў і шлях адступлення ад Варшавы, калі прыходзілася адбівацца ад насядаючага ў дзесяць разоў мацнейшага праціўніка і неаднаразова вырывацца з поўнага абкружэння.

Пасля ліквідацыі франтоў тав. Лынькоў год працуе ў Чэлябінскім губпрадкоме, дапамагаючы совецкай уладзе ліквідаваць цяжкія сляды голаду 1921 года.

У 1922 годзе, пасля канчатковай дэмабілізацыі, тав. Лынькоў вяртаецца на радзіму і да сваёй прафесіі. У мястэчку Свержань ён працуе ў семігодцы. Кіпучая дзейнасць сярод мясцовага сялянства, арганізацыя камітэта ўзаемадапамогі, дапамога сельсовету, прапагандысцкая работа ў ячэйцы комсамола вылучаюць тав. Лынькова з асяроддзя настаўнікаў. Мясцовыя комуністы зблізжаюцца з ім у рабоце, і ў 1925 годзе партячэйка соўгаса «Турск», што за 12 кілометраў ад Свержаня (гэта была самая блізкая партыйная арганізацыя) прыняла яго ў кандыдаты партыі, у члены партыі тав. Лынькоў пераведзен у 1926 годзе ў Бабруйску.

У гэтыя-ж годы тав. Лынькоў пачынае сваю селькораўскую дзейнасць, друкуючы рад артыкулаў і заметак у газеце «Комуніст». Селькораўская работа разбудзіла ў Лынькову драмаўшыя сілы пісьменніка, ускалыхнула яго даўнішнюю цягу да мастацкага слова, адкрыла выхад накопленым вобразам і жыццёваму вопыту. У 1925 годзе, вылучаны спачатку на пасаду сакратара, а потым рэдактара акруговай газеты «Комуніст», тав. Лынькоў друкуе ў гэтай газеце свае першыя апавяданні «Гой», «З пражытых год», піша фельетоны.

Пачынаецца другі этап жыцця Міхася Лынькова — этап барацьбы пісьменніка-комуніста за пролетарскую беларускую літаратуру, за яе ўзлёт і за яе ачыстку ад нацыянал-фашысцкай погані. Гэтая барацьба ішла двума шляхамі — шляхам актыўнага ўдзелу ў жыцці пісьменніцкіх арганізацый і кіраўніцтва імі і шляхам уздзейнічання на літаратуру сваёй уласнай творчасцю.

Тав. Лынькоў заўсёды вызначаўся як змагальнік супроць буржуазнага нацыяналізма ў літаратуры і яго канкрэтных носьбітаў, як абаронца партыйных поглядаў на развіццё нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу беларускай літаратуры, як ініцыятар інтэрнацыянальных сувязей беларускай літаратуры з літаратурамі братніх совецкіх рэспублік. Будучы загадчыкам выдавецкага сектара Дзяржаўнага выдавецтва БССР пасля першага разгрому нацыянал-фашыстаў, будучы рэдактарам журнала «Полымя рэволюцыі» і адным з кіраўнікоў Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР пасля 1932 года і зараз, выконваючы абавязкі старшыні саюза і парторганізатара, тов. Лынькоў заўсёды быў і застаецца ў першых радах тых, хто на справе дапамагае партыі ачышчаць беларускую літаратуру ад усякай гнілі і плесені, вырошчваць новыя кадры совецкіх літаратараў, рухаць літаратуру наперад.

Як пісьменнік, тав. Лынькоў з першых радкоў зрабіў сваё мастацкае слова вострай зброяй партыі Леніна—Сталіна. Яго першае апавяданне «Гой», надрукаванае ў 1926 годзе, ускхвалявана і прачута ставіла пытанне інтэрнацыянальнага адзінства працоўных, аб'яднаных агульнай барацьбой супроць сваіх класавых ворагаў. Да гэтай тэмы ён вяртаецца не раз — і ў «Апошнім зверыядаўцы», і ў «Чырвоных Лядах», і ў радзе дробных апавяданняў — «У мястэчку», «Беня Балагол» і інш. Вобразы мястэчковых дзяўчат, якія рвалі адвечныя путы кагала, як гэта зрабіла Рыва, якія рваліся да навукі, як Эйдля, дачка старога Шолама, — адны з найбольш лірычна паладзеных вобразаў у Міхася Лынькова. У яго заўсёды знаходзіцца цёплае слова, ласкавы, сапраўдны народны гумар, калі ён апісвае нашу совецкую моладзь, яе мары і справы. Варта ўспомніць хоць-бы вобраз лётчыка Мядзведзкі і дзяўчыны, у якую ён закахаўся ў часе перадачы комсамолам паветранаму флоту новага самалёта, але імя якой забыўся запытацца.

Такое-ж цёплае, прачутае слова вы пачуеце ад Лынькова і калі ён апісвае герояў соцыялістычнай працы альбо герояў грамадзянскай вайны. Такімі апісаны ў яго стары машыніст-ордэнаносец Андрэй Лятун, чырвоны камандзір Міхась, квартэрмейстар Бадай, Васька Шкет і Іван Разанскі—у апавяданні «Над Бугам», непрыкметная гераіня Рышіна Скварчук, малога сына якой задавілі бандыты, помсцячы за яе актыўную совецкую работу.



Цёплае слова вы пачуеце ад Лынькова і калі ён піша пра нашу совецкую дзетвару і для нашай дзетвары. Ен прывівае дзецям любоў да навукі, да гераічных учынкаў, ён радуецца разам з імі і радуе іх. Гэткія яго «Прыгоды храбрага вавкі Мішкі», «Міколка-паравоз» і інш.

Але слова Міхася Лынькова пачынае палымнець усёспапяляючым гневам і нянавісцю, калі ён гаворыць пра класавага ворага, пра кулакоў з «Чырвоных Лядаў» — Івана Цымбала і Хвядоса Мялу, пра белагвардзейца Граеўскага, які прыкрыўся партыйным білетам, украдзеным у расстралянага чырвонаармейца, пра чалавека ў футляры Аркадзія Ермалаевіча, пра дэзертыра і дыверсанта. Знішчальны сарказм, выкрыванне ўсіх змяіных ходаў ворага, усіх яго брудных спраў, узмацненне большэвіцкай пільнасці ў сваіх чытачоў — вось чым багаты творы Міхася Лынькова. Майстар навелы, майстар невялічкага апавядання, Міхась Лынькоў паказаў сябе здольным мастаком і ў шырокіх палотнах літаратурных твораў.

Бегла акідваючы вокам творчасць Лынькова, мы павінны адзначыць рознастайнасць яго тыпажу, чоткасць у акрэсленні герояў, багатую, сакавітую народную мову, жыццёрадаснасць і жыццёсцвярджальнасць, палітычную завострэнасць. Гэтаму ён вучыўся ў лепшых класікаў рускай літаратуры, у прыватнасці ў Гогаля і ў Аляксея Максімавіча Горкага, у літаратараў братніх народаў СССР, і гэта цэніць у яго творах наш совецкі чытач.

Совецкія пісьменнікі БССР аднадушны ў поглядах на тое, што тав. Лынькоў варты таго давер'я, якое аказалі яму таварышы рабочыя і калгаснікі Суражскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці—радзімы яго бацькоў, вылучыўшы яго кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

М. КЛІМКОВІЧ.


З выстаўкі «XX год Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота». Злева направа: 1) карціна з трыпціха **П. П. Сокалава-Скаля «Щорс»;** 2) карціна **І. Г. Драздова** «К. Е. Варашылаў сярод чырвонафлотцаў лінкора «Марат»; 3) карціна **В. Г. Одзінцова** «Байцы на выбарах у Вярхоўны Совет СССР».

НА ВЫСТАЎЦЫ „XX ГОД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ і ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА"

Ідэя арганізацыі выстаўкі «XX год Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота» належыць Наркому Абароны маршалу Совецкага Саюза тав. К. Е. Варашылаву. Гэта выстаўка — вялікае свята совецкіх мастакоў. Работам для гэтай выстаўкі мастакі аддавалі ўсе свае сілы.

Да выстаўкі совецкія мастакі рыхтаваліся два гады. Шмат тэм, багацце і рознастайнасць выбару аб'ектаў давалі невычарпальныя магчымасці для творчай фантазіі мастака. Па ўсёй краіне раз'ехаліся майстры кісці і разца, вывучалі чырвонаармейскі і чырвонафлоцкі быт, вахту пагранічніка, вучобу і культурнае жыццё байцоў. На выстаўцы прадстаўлена каля 300 работ, выкананых маслам, каля 100 работ графікі і сатыры і 25 скульптурных.

Выстаўка з'яўляецца чацвертай мастацкай выстаўкай, прысвечанай нашай слаўнай Чырвонай Арміі.

У выстаўцы ўдзельнічаюць мастакі амаль усяго Совецкага Саюза—старое і маладое пакаленне. Найбольш шырока прадстаўлены маскоўскія мастакі.

Вядомы мастак А. М. Герасімаў выставіў выдатнае палатно, якое паказвае таварышаў Сталіна і Варашылава на прагулцы ў Крэмлі. Правадыры паказаны на пярэднім плане, фонам для якога служыць велізарны від на Маскву. Мастак па-майстэрску адлюстраваў фарбамі прахладны дзень пасля дажджу, мокры тратуар і як-бы лёгкі ветрык. Партрэтам правадыроў Герасімаў сумеў надаць велізарную ўнутраную цеплыню і сканцэнтраванасць. Позіркі правадыроў накіраваны ў бок будуючагася Палаца Советаў.

Мастак В. С. Сварог выставіў цудоўную работу, якая паказвае авіяцыйнае свята на Тушынскім аэрадроме. Парашутысты спускаюцца радаснымі гасцямі з неба. Адна з парашутыстак паказана на пярэднім плане ў часе прызямлення. У яе ў руках букет кветак. Гэты букет яна працягвае ў бок назіраючых авіяцыйнае свята членаў Палітбюро на чале з таварышам Сталіным. Мастак напісаў гэту карціну яркімі, сакавітымі фарбамі.

А. В. Маравоў выставіў карціны: «Таварышы Ленін і Сталін за бяседай» і «Таварышы Ленін і Сталін ля прамога провада». Гэтыя карціны вельмі ўдаліся аўтару.

Адно з цэнтральных месц на выстаўцы займае вялікі трыпціх мастака Сокалава-Скаля. Трыпціх прысвечан легендарнаму герою грамадзянскай вайны — камдзіву Шчорсу. У цэнтры паказана сустрэча Шчорса з партызанам Бажэнка. Найбольш ярка паказана гібель Шчорса.

Мастак П. І. Котаў у карціне «Трывога» удала вырашыў, у прыгожай шэрай гаме, групу кавалерыстаў, якія спешна сядлаюць коней. Карціна выканана некалькі эскізна, але носіць дынамічны, жывы характар; глядзіш на яе і верыш, што гэта іменна — трывога.

Вельмі жывая карціна мастака Пластова — «Купанне коней чырвонаармейцамі». Гэты майстар валодае выключнымі якасцямі: сакавітым жывапісам і багатым каларытам.

Г. К. Савіцкі паказаў сустрэчу чырвонаармейцаў з калгаснікамі пасля манеўраў.

Дастаткова шырока прадстаўлена на выстаўцы і маладое пакаленне маскоўскіх мастакоў. Мастак В. П. Ефанаў выставіў цікавую і прыгожую па кампазіцыі і фарбах карціну «Оперная студыя Станіслаўскага ў падшэфных—слухачоў Ваенна-Паветранай Акадэміі». Мастак Салаўёў выставіў палатно «На манчжурскай граніцы», мастак Дорахаў — «Трывога на караблі» і інш.

Сярод работ ленінградскіх мастакоў асабліва вылучаецца карціна І. І. Бродскага. Яна паказвае зімовы пейзаж. Шэры дзень, ускраіна лесу, злева кустарнік з ажурна-дробна выпісаным голлем. На першым плане — Нарком Абароны тав. К. Е. Варашылаў на лыжнай прагулцы. Гэта карціна Бродскага — адна з удалых яго работ.

Паказаны на выстаўцы і батальныя карціны. Праўда, большасць карцін на батальныя тэмы яшчэ далёкі ад дасканаласці, але яны паказваюць значны рост совецкага батальнага жывапісу.

Мастак-баталіст Фрэнц паказаў кампазіцыю на тэму камбініраванай атакі танкаў, кавалерыі і авіяцыі. Карціна ўдалая — добра паказаны дынамічнасць бягучых коней і ўзаемадзейнічанне родаў зброі. Да мінусаў гэтай карціны можна аднесці толькі яе рыжаваты, некалькі аднастайны каларыт.

Баталіст М. І. Авілаў паказаў ліхую чацвёрку коней, запрэжаных у тачанку. Тачанка пераехала рэчку і спрытна ўзляцела на кругы бераг. У далечы, за ракой, відаць чарада імкнучых тачанак. Другая карціна Авілава — «Спайманне дыверсанта». Сцэна адбываецца на паўночна-заходняй граніцы нашай краіны, дзе зоркія пагранічнікі злавілі ворага. Мастаку ўдалося паказаць момант захопу. Дыверсант, схоплены сабакам за руку, упаў у снег, а тут ужо падаспелі на конях чырвоныя пагранічнікі.

Ваенна-Марскі Флот знайшоў у батальных карцінах таксама значнае адлюстраванне. Марэніст Н. Е. Бублікаў, —вучань Айвазоўскага і Куінджы, адзіны спецыяліст і выдатны майстар па паказу мора, бурлівага і грознага, — выставіў сваю цікавую работу «Ваенныя караблі ў кільватэры».

Пішучы гэтыя радкі выставіў карціну «Таварыш Варашылаў сярод чырвонафлотцаў на лінкоры «Марат». Мне, як аўтару гэтай карціны, хацелася спалучыць цеплыню ўзаемаадносін паміж наркомам і чырвонафлотцамі з цеплынёй сонечных праменняў жнівеньскага дня. Фонам служаць узнятыя ўгору грозныя гарматы, якія як-бы гавораць: мы змагаемся за мір, але заўсёды гатовы адбіць хоць якога ворага, які паспрабуе пасягнуць на свяшчэнныя граніцы совецкай радзімы.

Калі маскоўскія і ленінградскія мастакі прадстаўлены на выстаўцы даволі поўна, дык гэтага, нажаль, нельга сказаць аб мастаках некаторых нашых саюзных рэспублік. Ад Совецкай Украіны ўдзельнічае на выстаўцы ўсяго 6 майстроў. Мастак І. Шульга выставіў «Братанне совецкіх маракоў з французскімі матросамі ў Одэсе». Карціна досыць жывая па кампазіцыі і па псіхалогіі. Залішняя выпісанасць робіць гэту карціну некалькі фатаграфічнай.

Нядрэнная па агульнаму каларыту і карціна ўкраінскага мастака Козіка, якая паказвае чырвонафлотца-адпускніка, які гутарыць са сваякамі. Карціна чыста ўкраінскага характару як па касцюмах, так і па афармленню хаты «ручнікамі».

Мастак Мучнік адлюстраваў на палатне адзін з трагічных момантаў гісторыі грамадзянскай вайны: патапленне Чорнаморскага флота. На карціне паказана сцэна патаплення броненосца «Свободная Россия». Пераканаўчымі фарбамі мастаку ўдалося паказаць як момант патаплення броненосца, так і перажыванні матросаў у момант патаплення карабля.

З поспехам выступаюць на выстаўцы і мастакі Совецкай Грузіі. Праўда, работ грузінскіх мастакоў выстаўлена мала, але па сваёй якасці яны дастаткова высокія. Таленавіты мастак Кутатэладзе выставіў нядрэнную карціну «Таварыш Орджанікідзе сярод горцаў-партызанаў на Каўказе». Мастак Іраклій Таідзе паказаў на выстаўцы досыць добрую кампазіцыю на тэму «За радзіму». Гэтай карціне, як і іншым работам Таідзе, некалькі перашкаджае ўмоўны каларыт, але аўтар яшчэ досыць малады і ў будучым ад гэтага недахопу бясспрэчна пазбавіцца.

Армянская Совецкая рэспубліка прадстаўлена на выстаўцы двума мастакамі: народным мастаком Арменіі Сар'янам і мастаком Налбандзьянам.

Нельга не выказаць некаторага здзіўлення і шкадавання, што на гэтай выключнай па свайму значэнню мастацкай выстаўцы зусім не прадстаўлены работы мастакоў Совецкай Беларусі. Чаму гэта? Нам вядома, што беларускія мастакі працуюць над абароннай тэматыкай. Магчыма, якасць іх работ яшчэ нізкая? Гэтаму не хочацца верыць. Мастакі Совецкай Беларусі жывуць на граніцы з капіталістычным светам і абаронная тэматыка павінна быць асабліва ўласціва іх работам. У сваёй творчасці яны павінны паказаць свой народ, гераічных пагранічнікаў, паказаць гатоўнасць беларускага народа ў любую хвіліну стаць на абарону совецкай радзімы.

Застаецца пажадаць, каб на наступнай справаздачнай мастацкай выстаўцы абаронная творчасць беларускіх мастакоў была прадстаўлена і, па магчымасці, больш поўна.

Аддзел графікі на выстаўцы «XX год РСЧА і Ваенна-Марскога Флота» па колькасці экспанатаў невялікі. Цікавыя па кампазіцыі і строга акадэмічныя па малюнку, як заўсёды, работы мастака Шылінгоўскага па аддзелу Ваенна-Марскога Флота.

Рознастайны аддзел сатыры. У гэтым аддзеле прадстаўлены найбольш відныя совецкія сатырыкі. Мастак Ганф выставіў работу «Нагляды урок гісторыі». На малюнку асобнымі карткамі паказаны бітыя вялікім рускім народам агрэсары гісторыі: нямецкія псы-рыцары, татары і Антанта. Тры з картак пустыя; гэтыя карткі пакінуты для тых, хто мае намер занесці крывавую руку над краінай соцыялізма.

Скульптурная творчасць прадстаўлена на выстаўцы работамі Андрэева — бюсты таварышоў Леніна і Сталіна; Мендэлевіча—бюст Героя Совецкага Саюза тав. Чкалава; скульптара Нерада—бюст тав. Молатава. Паказаны на выстаўцы і работы майстроў Палеха і Метэры на рэвалюцыйныя і бытавыя сюжэты.

З першых-жа дзён адкрыцця мастацкая выстаўка карыстаецца вялікай увагай як масквічоў, так і прыязджаючых у Маскву рабочых, калгаснікаў, чырвонаармейцаў і камандзіраў з іншых рэспублік, з гарадоў і раёнаў нашай радзімы.

Гэта выдатная выстаўка будзе паказана не толькі ў Маскве, але таксама ў Ленінградзе, Кіеве і Менску.

Мастак І. Г. ДРАЗДОЎ,
член выставачнага камітэта,
Масква.

НАТАТКІ МАСТАКА

РОСТ МАЛАДЫХ

Можна з упэўненасцю сказаць, што да 20-гадовага юбілея Чырвонай Арміі мастакі Совецкага Саюза прышлі з велізарнымі дасягненнямі. Выстаўка «XX год Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота» паказала творчы рост усіх майстроў жывапісу.

Калі я пачаў кампанаваць для гэтай выстаўкі сваю карціну «На выбарах у Вярхоўны Совет СССР», мне хацелася адлюстраваць унутраную цеплыню адносін паміж людзьмі нашага Саюза Рэспублік. Хацелася паказаць, што выбары ў Вярхоўны Совет для совецкага грамадзяніна — справа блізкая, справа, якая выконваецца з найвялікшай любоўю да выбіраемых людзей, з найвялікшай любоўю да Краіны Советаў,— нашай радзімы.

Аблічы людзей, якія праходзілі каля выбарчых урнаў, як я назіраў іх, былі поўны стрыманай урачыстасці. Памятаю аднаго старога будаўніка, які ўвайшоў у пакой выбарчага ўчастка і доўга задуменнымі вачыма глядзеў на нас, выбаршчыкаў, і на ўсю абстаноўку. Гэтыя старыкоўскія задаволеныя вочы запомніліся мне асабліва добра. Пасля, калі я пісаў карціну, я знайшоў гэтага старога і ён пазіраваў мне некалькі дзён. Многія галовы і фігуры мне ўдаваліся не адразу і я перапісваў іх па некалькі разоў. Змяняў натуру і пісаў зноў і зноў.

Мне-б хацелася адзначыць, што абедзве апошнія выстаўкі — выстаўка «XX год Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота» і выстаўка, якая хутка адкрыецца, — «Індустрыя соцыялізма», — створаны на аснове велізарнай працы мастакоў, працы не толькі над дадзенай карцінай, але і над сабой. Бо, каб падыйсці да напісання карціны, трэба стварыць у сябе асаблівы творчы ўздым, асаблівае напружанне, якое нараджаецца ў выніку вялікай падрыхтоўчай работы.

На выстаўцы «XX год РСЧА і Ваенна-Марскога Флота» вельмі многія мастакі дасягнулі такога ўзроўню ў сваіх творах, якога мы яшчэ не ведалі ў нашым совецкім жывапісу, і мы ўправе зараз спыніць усякія гутаркі аб «адставанні» совецкага жывапісу ад астатніх мастацтваў.

Хочацца пачаць з карціны Кукрыніксаў «Раніца афіцэра».

Нягледзячы на поўную адсутнасць шаржа ў карціне, пры чоткай рэалістычнай трактоўцы ўсіх фігур, у тым ліку і афіцэра, аўтары здолелі даць знішчальную характарыстыку тыпажу. Вастрыё сарказму звернута не толькі ў мінулае. Зусім недалёка, за рубяжом, можна наглядаць і гэты мутны варшаўскі ці берлінскі досвітак, і гэтага двуногага пазяхаючага звера пасля п'янай ночы, і гэтую зняважаную фігуру, таропка падбіраючую аскалёпкі пасуды.

У карціне Пластова «Купанне коней чырвонаармейцамі» ва ўсю шырыню паказана магутнасць буйнай кампазіцыі. Велізарныя прасторы адкрывае мастак у сваёй карціне — бурны рух, смех і крыкі, гарачае летняе сонца, якое лле свае шчодрыя праменні на здаровыя чалавечыя целы, на бурапенячую ваду і спіны коней. Мастак заражае шырынёй ахопу гэтага кіпучага жыцця, яркасцю свайго адчування кожнага персанажа і кожнай дэталі.

Варта асаблівай увагі работа Ефанава «Оперная студыя Станіслаўскага ў падшэфных — слухачоў Ваенна-Паветрана Акадэміі». Урачыстасць гэтай рэчы, цёплае святло з розных крыніц, цёплыя празрыстыя цені, кантрасныя колеры касцюмаў і ўсёй абстаноўкі ствараюць настрой прыўзнятасці. Гэта адчуванне свабоды і паўнаты жыцця праходзіць праз кожную паказваемую асобу.

Якое багацце новых імёнаў, новых таленавітых мастакоў паказала юбілейная выстаўка! Майораў з яго шчырай і цэльнай карцінай адразу заўважаецца нават на гэтай вялікай выстаўцы. У карціне «Чырвонаармейцы ў Эрмітажы» глядач заўважае багацце індывідуальных характарыстык. Налбандзян і Кутатэладзе, ужо вядомыя нам па іншых выстаўках, паказваюць далейшае ўскладненне пошукаў вялікай глыбіні жыццёвасці ў сваіх работах.

Выдатная работа Шэгаля «Уцёкі Керанскага». Яна добра паказвае перапалох і разгубленасць у асяроддзі ўцякаючай белагвардзейшчыны. Нажаль, карціна перагружана рэчамі, якія часам перашкаджаюць гледачу знайсці добра зробленыя фігуры. Так, губляецца, не даходзіць да гледача галава афіцэра ля коміна.

Часта бывае так, што асабістыя адносіны аўтара да матэрыялу цяжка прачытаць у яго рэчы. Гэта здараецца пры халодных адносінах аўтара да паказваемага. А. Нюрэнберг пазбегнуў гэтага. Ён знайшоў сваю цёплую мову для таго, каб добра, пераканальна паказаць людзей у «Провадах». Глядач разам з мастаком перажывае радасны, вясёлы настрой, гледзячы карціну «Гулянне», з добрадушнымі старымі музыкамі ў аркестры, з моладдзю, якая танцуе на заднім плане, з лёгкім сонечным пейзажам.

У канцы хочацца зрабіць кароткую заўвагу аб усіх нашых мастаках. Яна ў наступным: нашы мастакі — мастакі эпохі соцыялізма, ствараючы сваё новае мастацтва, з першых сваіх крокаў па-праву адчуваюць сябе наследнікамі ўсяго сусветнага мастацтва.

В. Т. ОДЗІНЦОЎ.

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ЕКАЦЯРЫНА КУЛЬБА

Сярод густых заімшэлых будынкаў вёскі Окарынічы стаяла невялічкая, пахіленая да плоту, з лапленай страхою, хацёнка, у ёй было душна і цёмна. Нават маленькія закарузлыя ваконцы — і тыя былі затыркнуты скруткамі патрэп'я. І жыў у ёй, на поўнадзеле лабастых бугроў, прыгнуты горам Якаў Вальковіч са сваёю жонкаю Агатай. І не раз ён папракаў сваю жонку:

— Усё дачок мне родзіш!.. А што толку з іх...

Агата моўчкі выслухоўвала дакоры мужа і, прытуліўшы да сваіх грудзей ні ў чым невінаватае маленькае дзіця, ціха плакала над ім.

А калі раніцай тысяча дзевяцьсот сёмага года ў Агаты нарадзілася шостая дзяўчынка, бацька разззлаваўся ўшчэнт і, аблаяўшы жонку, выйшаў за дзверы.

У той дзень ён доўгі час разгублена блукаў па вуліцы, каля́сіў ля будынкаў, і калі хто пачынаў з ім гаворку, ён касавурыўся на яго і, чухаючы патыліцу, злосна агрызаўся:

— І так задыхаешся, а тут, на табе, дачка...

— За вакно не выкінеш... — суцяшалі суседзі

— Падрасце крыху — у нянькі пойдзе, ці ў пастушкі аддасі каму... — разважліва гаварыў сівабароды дзед, пазіраючы на разгубленага Якава.

Калі на стале ў бацькі не было і крошкі хлеба, ён узяў васьмігадовую дзяўчынку за руку і ціха сказаў:

— Пойдзем, дачушка!

Каця здзіўлена зірнула на пануры шчаціністы твар бацькі і, не ведаючы ў чым справа, запыталася:

— Куды, тата?

— У нянькі пойдзеш.

— У нянькі? — перапытала дзяўчынка і, тулячы галаву ў плечкі, пакорліва закрочыла за бацькам.

Знясіленая Каця, курчачыся на ложку, сядзела як прыкаваная, каля калыскі, гушкала яе, а ў самай зліпаліся вочы, да непрытомнасці хацелася спаць і нібы свінцом наліваліся рукі.

— Досыць ужо, адсядзелася ў хаце, пара за плугам пускаць яе. Нечага там... — неяк прабурчаў поп Струкоўскі і, падазваўшы фурмана, загадаў:

— Заўтра ў поле яе...

Фурман паглядзеў на худы, збялелы твар дзяўчыны і сэрца яго сціснулася ад жалю. Ён хацеў быў нешта сказаць, але замяўся, змаўчаў.

Так дзесяцігадовая Каця была прымушана з самага ранку і да позняга вечара басанож корпацца на папоўскім полі.

Нават у святочныя дні поп знаходзіў Каці работу, каб ні мінуткі не прагуляла, не пайшла куды. І калі дзяўчына спрабавала спасылацца на свята, поп тарашчыў на яе вочы і тут-жа гаварыў:

— Ты, Екацярына, не бойся, што свята, працуй, я за цябе адмалюся...

Такі-ж быў лёс Екацярыны і ў кулакоў Тараканавых. Шэсць з лішнім год адгаравала Екацярына батрачкай пад папоўска-кулацкім уціскам. Здавалася, што гору канца не будзе.

Але канец гору прышоў. І як ранняя веснавая кветка пад палымнеючым сталінскім сонцам зацвіло ў калгасе шчаслівае Екацярыніна жыццё.

Раніцай, таропка насунуўшы на ногі чаравікі, напяваючы вясёлую радасную песню, Екацярына з ліхтаром у руках спяшалася ў абору, пазірала ў кармушках, набірала ў вядро чыстай летняй вады, з перакладзіны здымала ручнік, падмывала каровам вымя, потым садзілася на невялічкі зэдлік, рабіла масаж і, умацаваўшы ў каленях дайніцу, пачынала даіць.

Пацiскаючы цёплыя, пругкія саскі кароў, яна з радасцю пазірала на касыя белыя струменьчыкі, якія цурчэлі ў дайніцу, і тут-жа рабіла свае меркаванні, як павялічыць удой малака. Управіўшыся ў аборы, яна ішла на зялёныя калгасныя гароды, збірала траву і, напхаўшы мяхі зелянінай, спяшалася падкарміць сваіх «Мальвіну», «Сініцу», «Рабу»...

А калі клапатлівы працоўны дзень хаваўся ў вячэрнім змроку і напоўненыя збаны сырадою адпраўляліся з аборы, Екацярына падлічвала вынікі дня і гаварыла даяркам:

— За «Мальвінай» трэба лепш прыглядзець. Яна павінна даць не менш восемнаццаці літраў.

І Екацярына дабівалася свайго.

Сваёй адданасцю і ўмельствам, сваёй стаханаўскай работай яна ламала ўстарэўшыя нормы і дабівалася ўсё новых і новых рэкордаў на ферме.

І калі ў калгасе здарылася няшчасце — захварэла дваццаць цялят, тады працаваць у цялятнік паслалі Екацярыну.

Як маленькіх дзяцей, падаграваючы на прымусе малако, пеставала Екацярына калгасных цялят. І праз некалькі тыдняў усё пагалоўе было здаровым.

— От табе і баба... — дзівіліся мужчыны.

Па бясконца доўгіх рэйках, праз шырокія калгасныя палі, паўз горы і рэкі неабдымнай радзімы імчыць кур'ерскі поезд у Маскву.

Абапёршыся на столік, у мяккім купэ сядзіць ля вакна Екацярына. Яна едзе на з'езд. Ужо далёка за поўнач. Але Екацярына не спіць. Ды дзе-ж там спаць, калі ўсхвалёванае ад радасці сэрца тахкае, б'ецца ў грудзях.

І вось шумлівая маскоўская раніца прыветліва сустрэла Екацярыну.

Яна разам з лепшымі прадстаўнікамі вялікіх народаў Совецкага Саюза займае месца ў Крэмлёўскай зале і з нецярпеннем чакае хвіліны, калі за сталом прэзідыума паявіцца той, хто даў шчасце народу, хто ашчасліві́ў жыццё Екацярыны, — вялікі, любімы, родны Сталін.

І вось перад вачыма Екацярыны, разам са сваімі саратнікамі, у простым адзенні, да стала шагае правадыр.

Грахоча зала, нясуцца крыкі: «Ура! Любімаму Сталіну — ура!» І з нарастаючай сілай гучаць апладысменты.

Екацярына глядзіць на роднага Сталіна, апладыруе яму і з яе вачэй— ад непамернай радасці — па твары коцяцца слёзы.

І ніколі ў жыцці не забудзе Екацярына таго хвалюючага радаснага моманту, калі ў часы работы другога Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў таварыш Сталін падышоў да яе і, паклаўшы сваю руку на яе плячо, пачаў распытваць яе пра жыццё і работу ў калгасе.

Тады з крэмлёўскай трыбуны Екацярына гаварыла:

— Успомнім, таварышы, мінулыя годы. Ды і цяпер заграніцай жанчыны закабалёны памешчыкамі і кулакамі, і нават сваімі мужамі. Там кажуць, што бабская справа—свінней карміць і больш нічога. У нашым Совецкім Саюзе мы не толькі ўмеем карміць свінней, а мы ліквідавалі сваю няграматнасць і ўжо ўмеем кіраваць нашымі калгасамі.

І Екацярына Якаўлеўна сапраўды ўмее выдатна кіраваць калгасам: каторы год яна кіруе малочна-таварнай фермай у калгасе імя Леніна, з'яўляецца членам праўлення, членам прэзідыума сельскага совета, членам ЦВК БССР. І давер'е народа яна з гонарам апраўдвае. У тысяча дзевяцьсот трыццаць восьмым годзе яна ўступіла ў рады КП(б)Б. Яе ведаюць людзі як верную дачку сваёй радзімы і таму чатыры тысячы семсот калгаснікаў Менскага раёна на сваіх сходах аднадушна вылучылі кандыдатуру Екацярыны Якаўлеўны Кульба ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР.

АЛЕСЬ СТАХОВІЧ.

Справа гонару кожнага калектыва самадзейнасці

У 1938 годзе перад мастацкай самадзейнасцю БССР стаяць вялікія і ганаровыя задачы.

Асноўная і першачарговая задача — прыняць самы актыўны ўдзел у абслугоўванні выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

1 жніўня 1938 года ў Маскве адкрываецца Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка, на якой апрача экспанатаў народнай творчасці будуць паказаны і лепшыя калектывы самадзейнасці БССР.

У адзнаку 21-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі ў Менску адбудзецца 3-я Усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці і 2-я Усебеларуская выстаўка народнай творчасці.

У гонар дня Сталінскай Канстытуцыі ў снежні бягучага года ў Маскве адкрыецца Усесаюзная выстаўка «Ленін і Сталін у народнай выяўленчай творчасці».

У 1939 годзе у Маскве адбудзецца дэкада беларускага мастацтва, на якой мастацкая самадзейнасць будзе разам з прафесіянальным мастацтвам дэманстраваць свае дасягненні перад вялікім Сталіным.

Справа гонару кожнага калектыва самадзейнасці—быць дапушчаным да ўдзелу ў гэтых мерапрыемствах.

Удзельнікі Усебеларускай нарады кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, якая адбылася гэтымі днямі ў Менску, звярнулася да ўсіх партыйных, комсамольскіх, прафсаюзных арганізацый, да ўсіх гурткоў і выканаўцаў мастацкай самадзейнасці БССР і работнікаў прафесіянальнага мастацтва з пісьмом, у якім заклікаюць шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва на права ўдзелу ва ўсіх вышэйпаказаных мерапрыемствах і дабіцца высокіх творчых паказчыкаў як для асобных удзельнікаў, так і для калектываў мастацкай самадзейнасці.

Удзельнікі нарады звярнуліся з заклікам да ўсіх работнікаў тэатраў, музычных устаноў, кампазітараў, пісьменнікаў і мастакоў—дапамагчы калектывам самадзейнага мастацтва ў іх творчай рабоце.

Удзельнікі нарады звярнуліся з просьбай да рэспубліканскага і раённага друку — устанавіць штодзённы нагляд за творчым спаборніцтвам калектываў самадзейнасці і дапамагчы ў выяўленні і папулярызацыі лепшых, перадавых калектываў і асобных выканаўцаў мастацкай самадзейнасці.

ТЭАТР „РОМЭН" ДА ВЫБАРАЎ

Маскоўскі дзяржаўны тэатр «Ромэн», які знаходзіцца на гастролях у БССР, правёў значную работу па абслугоўванню выбаршчыкаў гор. Менска. Так, на фабрыках імя Крупскай, імя Фрунзе, на заводах імя Варашылава і «Большэвік», у саюзе комунальнікаў і на спіртагарэлачным заводзе акторы тэатра выступалі перад рабочымі з чыткай урыўкаў з п'ес, з песнямі і пляскамі.

Тэатр выязджаў у чырвонаармейскія лагеры, дзе ім быў наладжан канцэрт.

6 чэрвеня тэатр ставіць шэфскі спектакль для менскага гарнізона. Зараз тэатр заканчвае падрыхтоўку інтэрмедыі, якая будзе пастаўлена ў Магілеве і Гомелі, куды тэатр выязджае на гастролі ў бліжэйшыя дні.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Г—4686.